НАША НІВА

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у панядзелкі. №32 (153) 29 ЛІСТАПАДА 1999 г.

П'яныя расейскія салдаты забілі маладую жанчыну і паранілі яшчэ дзьвюх, распачаўшы страляніну з аўтаматаў у вёсцы на мяжы Інгушэціі і Чачэніі.
24 лістапада пяцёра вайскоўцаў 138-й Санкт-Пецярбурскай мотастралковай брыгады прыехалі ў станіцу Сьляпцоўскую бронетранспарцёрам і запатрабавалі ў прадуктовым шапіку гарэлкі.



Беларус на вагу золата

Помнік у Салечніках

Заклікі берагчы мову, гістарычную праўду і незалежнасьць гучаць абстрактна, калі пры гэтым не заклікаюць берагчы чалавека, носьбіта згаданых каштоўнасьцяў, калі нацыянальная эліта ў заняпадзе, калі будзённа пачынаюць успрымацца паведамленьні пра тое, што нейкі паэт сьпіўся, нейкі мастак выкінуўся з вакна, нейкі музыка назаўсёды пакінуў краіну...

Беларуская нацыянальная эліта — тэма сёньняшняга нумару «НН», на старонках 6—7.

Шкада Расеі

Продаж гарэлкі ў Інгушэціі забаронены ўказам прэзыдэнта Аўшава. Прадавачка Ларыса Коціева адмовілася выконваць патрабаваньне, за што расейцы яе й расстралялі.

Кажуць, п'яныя, кажуць, вайна, рознае здараецца...

Рэч менавіта ў тым, што гэта вайна, а не якаясь там "антытэрарыстычная апэрацыя". Наўрад ці тыя салдаты, не знайшоўшы гарэлкі, пачалі б страляць, быўшы ў Тамбове ці Іванаве. Ды там іх і не пусьцілі б са зброяй за тэрыторыю вайсковай часткі. На Каўказе яны могуць сабе такое дазволіць, бо Каўказ — не Расея, і, што б ні казалі генэралы ды чыноўнікі, на пабытовым узроўні гэта ўжо даўна ўсьвядоміў кожны.

Але аднаго ўсьведамленьня недастаткова, бо ніхто ў Расеі ня кажа гэтага ўголас. Расейскія СМІ змабілізаваныя на чачэнскую вайну.

Працяг на старонцы 5.

Першы помнік Каліноўскаму

У Салечніках пад Вільняй адкрылі помнік Каліноўскаму. Не ўявіць сабе такога помніка ў Менску

Чаму першы і адзіны помнік нацыянальнаму герою Беларусі ставіцца за самаю беларускай мяжой? І чаму менавіта сёньня, напярэдадні падпісаньня дамовы з Расеяй, супраць «інтэграцыі» зь якой змагаўся і загінуў Кастусь Каліноўскі?

Прысутнасьць на ўрачыстасьці пасла РБ У.Гаркуна ды іншых афіцыйных асобаў ускосна нагадала пра той халодны сакавіцкі дзень 1864-га і натоўп пазіморуму адзетых людзей на засьнежаным пляцы ў блізкай адсюль Вільні, дзе загадам расейскага генэрал-губэрнатара Мураўёва 26-гадовы беларус Каліноўскі быў павешаны як бандыт.

Дзякуючы гэтай паралелі дзьве цырымоніі — карная і шанавальная — праз трэцюю, крамлёўскую, зблыталіся, нібы ў п'есе абсурду. Занадта шмат супярэчлівых падтэкстаў... Бясспрэчна адно — помнік ёсьць і ён разьлічаны на вечнасьць. Тут яму нішто не пагражае. Найперш — з боку прарасейскіх уладаў Беларусі.

За савецкім часам вобраз Каліноўскага сотні разоў ствараліў скульптуры, але помнікаў — няма. Каб прыглушыць антырасейскі сэнс дзейнасьці змагара, яго малявалі вучнем расейскіх рэвалюцыйных дэмакратаў. Узброены беларускі паўстанец-касінер ляпіўся то «заснавальнікам беларускае ленініяны» Грубэ, то аўтарам нязьлічоных партрэтаў Сталіна ды Мао Азгурам. Менавіта Азгураў бюст Каліноўскага стаіць на радзіме героя ў Сьвіслачы.

Пры канцы 80-х ідэя помніка Каліноўскаму авалодала масамі. Разважалі, дзе ставіць — у Менску ці мо ва ўсіх райцэнтрах... Але чамусь было вырашана паставіць яго толькі ў Горадні. Конкурсныя праекты Фінскага, Шатэрніка, Дранца разыходзіліся «ў розныя бакі». Гэта тлумачыцца тым, што Каліноўскі, узброены беларускі нацыяналіст і зацяты ўніят, «пранік» у беларускую савецкую ідэалёгію «пад чужою лічынаю» — як абаронца сялян, і ў такой гіпастазіі перакачаваў у незалежнае беларускае грамадзтва, якое не гатовае было прыняць ягоны антыімпэрскі радыкалізм. Таму яго ўяўлялі то вершнікам, які мкне ў атаку, то рэдактарам, які вычытвае карэктуру... Дыктатар-якабінец? Ідэйны беларускі нацыяналіст? Каталіцкі фундамэнталіст? Завадатар мужыцкага бунту? Сацыяліст-утапіст? Ліхі атаман?



Кастусь Каліноўскі на фота А.Банолды

Былі адкрылі рахунак на гарадзенскі помнік, але тут і новыя павевы наляцелі... А больш як два гады таму беларусы зь Літвы папрасілі ўрад Беларусі дапамагчы паставіць помнік Каліноўскаму ў Салечніках. Ініцыятарам выступіў загадчык тутэйшага Беларускага культурнага цэнтру Пётра Малафей. Ён сам асабіста знайшоў для яго ў ваколіцах Салечнікаў граніты валун. Міністэрства культуры Беларусі зрабіла замову вядомаму скульптару Валяр'яну Янушкевічу.

Павялося, што менавіта Янушкевіч рэпрэзэнтуе Беларусь для замежжа яшчэ ад тых першых, элеганцкіх шыльдаў з Пагонямі на ўваходзе ў МЗС, мэмарыяльнай шыльды Скарыны для Падуі (копія на італьянскім пасольстве ў Менску) і Агінскага для Флярэнцыі. Сам родам зь мястэчка, з Ракава, Янушкевіч ясна ўявіў сваю задачу: паставіць помнік у заходнебеларускім мястэчку герою тутэйшай гісторыі Каліноўскаму.

Чаму ў Салечніках? Тут побач, дзе Рудніцкая пушча сыходзіць у Катранскую, была лясная друкарня «Мужыцкае праўды». Тут быў маёнтак сям'і Далеўскіх, адзін зь якіх, Тытус, быў лепшым сябрам і асабістым ад'ютантам Каліноўскага. У тутэйшых ваколіцах багата паўстанцкіх магілаў. Тут гераічна загінуў адзін з кіраўнікоў паўстаньня Людвік Нарбут, у баі пад Дубічамі... Патрэцяе, Каліноўскі падпісваў свае адозвы «Яська, гаспадар з-пад Вільні».

Здарожаны інсургент, бяз зброі і сьцягоў, без крыжоў і тэатральных аркушоў паперы. Спыніўся, каб спарадкаваць ліхаманкавы бег думак, якія раяцца, раяцца ў галовах тых, хто гукае да зброі. Стылістыка ўзыходзіць да рамантызму XIX ст. Міцкевіч на гары Аюдаг...

Подпіс на чорным граніце зроблены беларускаю лацінкаю.

Не магу ўявіць сабе помніка Каліноўскаму побач з помнікамі Суворaву, Дзяржынскаму і Леніну. У РБ пакуль гаспадараць Калініны. Час Каліноўскіх пакуль яшчэ не прыйшоў.

Сяргей Харэўскі

навіны зь Беларусі за суботу й нядзелю

Краёўцы прайшлі шэсьцем у Вызьне

У мінулую суботу акцыю ў гонар угодкаў Слуцкага Збройнага Чыну правяла ў мястэчку Вызьне (цяпер Чырвоная Слабада) арганізацыя "Край". 60 чалавек у камуфляжнай форме з сымболікай БНР прайшлі шэсьцем ад ускрайку мястэчка да ягонага цэнтру. Краёўцы ўсталявалі жалезны крыж у парку ды ўсклалі вянкі з надпісамі: "Тым, хто пайшоў паміраць, каб жыла Бацькаўшчына". Мясцовая міліцыя зьявілася толькі па сканчэньні акцыі, але пабачыўшы арганізаваныя шэрагі, дала драла. Над крыжам прачытаў малітвы адзін са сьвятароў Беларускай праваслаўнай аўтакефальнай (народнай) царквы — ярэй Леанід. Удзельнікі акцыі раскідалі па паштовых скрынках улёткі і правялі нефармальную гутарку з вызьненцамі.

Таццяна Сьнітко

Слуцак—Лёндан

27 лістапада ў Лёндане адбылася вечарына, прысьвечаная ўгодкам Слуцкага Збройнага Чыну. Айцец Надсан адправіў малебен. Сярод эмігрантаў паваеннай хвалі і новых палітуцекачоў, а таксама беларускіх студэнтаў на навучаньні ў Брытаніі вылучаўся японскі студэнт з Манчэстэра, што вывучае беларускую мову. 10 сьнежня ў Лёндане Беларуска-Ангельскае таварыства ладзіць паэтычны вечар.

Зь Лёндану — Алесь Нешчарда

У Вярхоўным Савеце

У суботу засядала сэсія Вярхоўнага Савету, піша БелаПАН. Заслухалі генэрала Савічава, які даклаў пра пошукі сьлядоў Ганчара. Вырашылі: папярэдзіць, што подпіс Лукашэнкі пад саюзнай дамовай ня будзе мець юрыдычнай сілы, абралі на намесьніка старшыні Вярхоўнага Савету і сябра Прэзыдыюму дэпутата Лябедзьку. Васіля Капітана вызвалілі ад абавязкаў Генэральнага пракурора, а прызначылі Рыгора Пракаповіча, цяперашняга старшыню камісіі па заканадаўстве. Мабыць, нешта рыхтуюць.

Пасол Марыніч заклікаў да рэформаў

Пасол Беларусі ў Латвіі Міхаіл Марыніч заявіў, што Беларусі трэба асобнае Міністэрства замежнаэканамічных сувязяў, а ня проста аддзел гэткіх сувязяў у МЗС, бо сумяшчэньне замежнагаспадарчых і замежнапалітычных функцыяў можа дрэнна адбіцца на гаспадарцы. Пасьля прыезду Марыніча ў Рыгу рэзка ўзрос аб'ём гандлю Беларусі з Латвіяй і асабліва беларускі экспарт туды, прытым што агулам беларускі экспарт рэзка скараціўся за два апошнія гады. Пасольства ў Латвіі падрыхтавала таксама прапановы ўраду па рэформе сельскай гаспадаркі на прыбалыйскі ўзор — прыбалты экспартуюць збожжа нават у тыя гады, калі ў Беларусі няўрода. Міхаіл Марыніч узначальваў МЗЭС да 1998 году, а тады яго адправілі паслом у Латвіі, а міністэрства аддалі Латыпаву. У 1994 годзе апазыцыя ў Вярхоўным Савеце падтрымлівала кандыдатуру Марыніча проці Грыба, які йшоў тады ад большасьці.

Міліцыя налічыла

26 лістапада судзьдзя Барысёнак засудзіў кіраўніка праваабарончага цэнтру «Вясна-96» Алеся Бяляцкага за тое, што ў сядзібе цэнтру знайшлі 316 асобнікаў бюлетэня "Права на волю", друкаванага органу арганізацыі. А.Бяляцкі абвінавачаны ў парушэньні закону аб друку (без рэгістрацыі можна выдаваць накладамі ня больш за 300 асобнікаў). На судзе праваабаронца казаў, што раз ніхто з супрацоўнікаў «Вясны» не прысутнічаў пры падліку колькасьці асобнікаў, дык можна лічыць, што доказаў абвінавачаньня няма. Барысёнак жа пастанавіў лішнія бюлетэні зьнішчыць, а Бяляцкага ўкараў на 14 з паловай мільёнаў лукашэнкаўскіх рублёў. У "Праве на волю" многія беларускія вязьні сумленьня і сваякі няпраўдаю засуджаных друкавалі свае лісты і астрожныя ўспаміны.

Б.Т.

Ваўчаку прыз

Алег Воўчак, кіраўнік праваабарончай арганізацыі "Прававая дапамога насельніцтву", стаў ляўрэатам прэміі Міжнароднай лігі па правах чалавека. Але ці дадуць яму паехаць яе атрымаць? На ім жа крымінальная справа вісіць за 21 ліпеня.

Аляксей Шыдлоўскі

ліст да «ліцьвіноў»

Спадары «ліцьвіны»! Крыўдна бачыць, як вы, здаровыя душэўна і маральна, безумоўна веруючыя людзі, дарэмна марнуеце свой час на raspracoйki Lićvinskaje histaryjahrafiji і інш. ВКЛ, спадарства, гэта гісторыя. Вялікая, славутая, але гісторыя! Далучайцеся да беларусаў у будаваньні нацыянальнай школы, нацыянальнага бізнэсу, царквы. Давайце разам будаваць новую вялікую Беларусь — годную пераемніцу ВКЛ. Тады і перад сапраўдным на тым сьвеце сорамна ня будзе!

Жыве Беларусь!

Жыве вечна!

Алесь Загорскі, Шаркоўшчына

навіны зь Беларусі

Арт-кавярня трактарнага заводу

23 лістапада ў арт-кавярні «Дом ля дарогі» (ДК МТЗ) самыя маладыя з маладых беларускіх паэтаў, празаікаў ды выканаўцаў бардаўскай песьні правялі чарговую літаратурна-мастацкую вечарыну. Дзяўчаты і юнакі чыталі свае літаратурныя практыкаваньні ня толькі па-беларуску, але й на замежных мовах, найперш парасейску. Хоць маладыя жывуць пераважна ў расейскамоўным асяродзьдзі, найбольш удалыя тэксты ствараюць менавіта па-беларуску. Што й зразумела: на замежнай мове можна практыкавацца, і толькі на роднай — прамаўляць душой.

М.Ч.

Пратэзаў ня будзе

У Магілёве больш за месяц не працуе мясцовая філія артапэдычнага цэнтру, які вырабляе спэцабутак для інвалідаў і пратэзы — няма сродкаў на сыравіну. Работнікі пайшлі ў адпачынак без захаванння заробку. Цяжка з дэталямі для пратэзаў. У вобласьці 12000 чалавек карыстаюцца паслугамі прадпрыемства, дык чарга цяпер вялізная і безнадзейная: амаль 2500 замоваў. Прадпрыемства можа выратаваць пераход на платныя паслугі, але дзе ў інвалідаў грошы, каб плаціць?

З Магілёва — Сымон Глазштэйн

Людзі ў штацкім у Палітэхніцы

У сераду ў будынку Політэхнічнае Акадэміі чалавек у штацкай форме з пасьведчаньнем МУС затрымаў Зьмітра Шыракапытава, сябра сацыял-дэмакратаў, пры раздачы бюлетэня «Post Factum».

менскія нетры

ЛЕСЬВІЦА

З надыходам зімы самым небясьпечным месцам у Менску робіцца адна з найбольшых гарадзкіх лесьвіцаў, што між стадыёнам «Дынама» ды судом Ленінскага раёну. Напаўразбураная і заледзянелая, яна больш нагадвае адмыслова прыстасаваную трасу для падрыхтоўкі гарналыжнікаў. Калі ж вы не зьбіраецеся ўдзельнічаць у чарговай зімовай алімпіядзе, будзьце тут вельмі асьцярожныя — асабліва ўвечары (гэты цёмны глухі кут ледзьве-ледзьве асьветлены вокнамі былой Габрэйскай, а зараз 4-й больніцы) — можна пасьлізнуцца і балюча пабіцца. Нельга сказаць, што ўлады не зьвяртаюць увагі на гэткі непарадак: лесьвіцу штогод рамантуюць, аднак гэтая працэдура больш нагадвае дзіцячую гульню "ў пясочак": зьяўляюцца будаўнікі і, абсалютна ігнаруючы цэмэнт, лепяць прыступкі са жвіру. Сёлета, што праўда, верхнюю палову лесьвіцы ўрэшце адрамантавалі грунтоўна, але ня чысьцяць зусім, дык яна зарасла лёдам і нічым ня розьніцца ад паловы нерамантаванае. Адзінае, што можна параіць — абыходзьце небясьпечнае месца вуліцай Леніна. Хоць і няблізкі сьвет, але цалейшыя будзеце.

Андрэй Скурко



Фота Анатоля Клешчука

«ЛАНЦУГ СВАБОДЫ»: СПАНТАННЫ І ЭФЭКТНЫ

Беларуская апазыцыя навучылася праводзіць прыгожыя палітычныя акцыі. Нават у дзесяціградусны мароз, у цёмны час сутак, безь ніводнай улёткі ў Менску (першы правал новага Фронту) і бяз згадкі пра акцыю ў «Народнай волі» на «Жывую сьцяну Свабоды» прыйшло каля 2000 менчукоў, хоць ня ўсе са сьвечкамі, а ня ўсе тыя, што са сьвечкамі — з донцамі пластыкавых бутэлек, безь якіх сьвечкі гаснулі на вятрузе. Ланцуг расьцягнуўся ад Якуба Коласа да кінатэатру «Кастрычнік».

Мінакоў на праспэкце гэта моцна ўражвала. Ашаломленыя, яны пыталіся, што вымусіла столькіх людзей у такі мароз стаяць на вуліцы, а даведаўшыся, сымбалічна далучаліся.

Акцыя была прымеркаваная да трэцяй гадавіны пераварота, а таксама супраць саюзу з Расеяй. Саюзу не атрымалася. Пакуль што. Афіцыйная вэрсія — з-за хваробы Барыса Ельцына. (Неафіцыйна кажуць, што Пуцін «ня даў дзеду таблетак», і таго ўжо няма.) Але кожны з тых, хто стаяў 24-га ў жывым ланцужку, адчувае гонар, мяркуючы, што ў зрыве ганебнага падпісаньня ёсьць і яго, хай і маленькая, але заслуга. На сканчэньні акцыі затрымалі 5 юнакоў, двух зь іх афіцыйна папярэдзілі.

Каля 1000 чалавек выйшлі на аналягічную акцыю ў Горадні (трох, у тым прафэсара Астроўскага, затрымалі), пара дзясяткаў — у Берасьці, дзе прадстаўнікі грамадзкасьці пасьля шчэ і ўручылі пэтыцыю пратэсту ў расейскае консульства.

Цяпер у вялікіх масавых акцыях будзе зроблены перапынак да вясны. Але ясна, калі ў сьнежні дамова ўсё ж будзе падпісвацца, дык людзі самі выйдуць на вуліцы, каб засьведчыць свой пратэст.

А што да заплянаваных акцыяў, дык старшыня БНФ Вінцук Вячорка заявіў, што ўжо хутка будзе распачатая падрыхтоўка да паўнавартаснага «Маршу Свабоды-2», які пройдзе ўвесну 2000 году.

Аляксей Шыдлоўскі

АЛЬТЭРНАТЫВА ФІЛАРЭТУ

ПРАВАСЛАЎЕ МОЖА СТАЦЬ НЕПРАДАЖНЫМ І БЕЛАРУСКІМ

Заявіўшы пра свой выхад з-пад юрысдыкцыі Маскоўскага патрыярхату, праваслаўныя вернікі зь Бераставіцкага раёну, што на Гарадзеншчыне, фактычна ўзялі на сябе місію аднаўленьня ў нашай краіне аўтакефальнай праваслаўнай царквы. Беларускія ўлады адрэагавалі на спробы праваслаўнага падзелу скрайне нэгатыўна. Камітэт па справах рэлігіяў без усякіх ваганьняў ахрысьціў вернікаў самаабвешчанай аўтакефаліі «дэструктыўнаю сэктаю». Тым часам сьвятар гэтых вернікаў, айцец Іван Спасюк, у адказ на перасьлед распачаў 7 лістапада галадоўку, якая працягваецца да сёньня. Мы патэлефанавалі ў пасёлак Пагранічны, які пры самых дратах беларуска-польскай мяжы. На нашыя пытаньні ласкава згадзіўся адказаць айцец Іван.

Як ён паведаміў, прыхаджане яго праваслаўнай Сьвята-Эўфрасіньеўскае грамады пастанавілі выйсьці з-пад юрысдыкцыі Маскоўскага патрыярхату яшчэ ў сёлетнім траўні. Выхад гэты быў абумоўлены, паводле сьцьверджаньняў вернікаў, адсутнасьцю маральных і духоўных якасьцяў ярархаў Маскоўскага патрыярхату. Айцец Іван падаў заяўку на рэгістрацыю свайго прыходу ў Гарадзенскі аблвыканкам — гаворка пайшла ўжо фактычна пра самастойную плынь у беларускім праваслаўі. Як ведама, адміністрацыйна незалежная ад іншых цэркваў праваслаўная царква беларускага народу — зьява ў імпэрска-савецкім кантэксьце немагчымая. Парасткі аўтакефальнага беларускага праваслаўя былі сьсечаныя ў часе рэпрэсіяў 30-х гадоў — дзейнасьць япархіяў спынілася тады ў выніку арыштаў япіскапаў і сьвятароў. Кароткі пэрыяд аднаўленьня беларускай аўтакефальнай царквы на бацькаўшыне прыпаў на час II усясьветнай вайны. Па вайне праваслаўная аўтакефалія лучыла беларусаў толькі ў заходнім сьвеце, прычым Маскоўская патрыярхія не прызнала самастойнай беларускай праваслаўнай царквы за мяжою. І вось сёлета пэрспэктывы праваслаўнага разьмежаваньня ў самой Беларусі сталіся відавочнымі. Праўда, тут дзяржава, ад якой царква аддзеленая паводле закону, актыўна выступіла з процідзеяньнем праваслаўным незалежнікам. «Хоць ты памры, а мы рэгістраваць ня будзем», — заяўляюць айцу Івану Спасюку ўва ўладных кабінэтах.

Пра выбар вернікаў з пасёлку Пагранічны ведае на сёньняшні дзень і мітрапаліт Філарэт. Відавочна, такі паварот сытуацыі ня можа не насьцярожваць Беларускі Экзархат — як ведама, у кожнай справе патрэбныя прэцэдэнты. З другога боку, відавочна й тое, што беларускія ўлады наўрад ці змогуць знайсьці хоць якую праўную падставу, адмаўляючы Сьвята-Эўфрасіньеўскаму прыходу ў рэгістрацыі. Пакуль, аднак, айцец Іван Спасюк ня бачыць ніякага іншага способу разьвязаць канфлікт, апрача як судовым шляхам. Цяпер рыхтуюцца тры пазовы ў суд — адзін зь іх, у прыватнасьці, на Аляксандра Кішчанку, кіраўніка Гарадзенска-Ваўкавыскай япархіі, за прыніжэньне годнасьці беларускіх вернікаў і нанясеньне ім маральнае шкоды. Сума гэтага пазову роўная сямі мільярдам беларускіх рублёў. Гэтыя грошы вернікі зь Бераставіцкага раёну хацелі б укласьці ў пабудову свайго храму.

Не выклікае сумневаў сур'ёзнасьць намераў тых людзей, якія дамагаюцца незалежнасьці ад традыцыйнага ў беларускіх умовах на працягу апошніх стагодзьдзяў праваслаўнага патрыярхату. Заслугоўвае ўвагі і той факт, што ажно 56 прыходаў Беларускай праваслаўнай царквы дэкляруюць фактычна сваю салідарнасьць з аднаўленьнем Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы ў нашай краіне і гатовыя ў выпадку перамогі айца Івана пайсьці ягонай дарогай.

Юрась Бушлякоў

бытавуха

Славамір АДАМОВІЧ

Жывы голас эміграцыі

«Навалілася на мяне страшэнная дэпрэсія ад гэтае чужыны, — піша з Амэрыкі беларуская жанчына. — Тры тыдні не магла спаць ні ноччу, ні днём. Такая скруха закруціла ад гэтае самоты, што з тыдзень тэмпэратурыла. Потым на два дні паехала ў беларускую царкву, дзе жывуць пяць нашых хлапцоў. Пачула родную мову і крыху ачуняла. Спала ў іх там дзьве начы, быццам мяне расстралялі, нават удзень выключалася. Адна беларуска прывезла мне пігулак ад дэпрэсіі, выпіла я штукі тры і неяк пачала паціху ажываць. А то і рукі, і ногі цэлыя, усё здаровае, а памяраю. Нават размаўляць сілаў не хапала.

Я працую ў чужой сям'і, там і жыву. На лета мяне зьвезьлі ў горы, адкуль да Нью-Ёрку чатыры гадзіны язды. Дарога каштуе каля 60 даляраў.

Мне часта ўзгадваецца наша апошняя сустрэча на праспэкце Скарыны. Гэта было ў жніўні, ты ляцеў на нейкі суд. Мы абняліся, і ты сказаў, што самае цікавае ў Беларусі толькі пачынаецца. Ты быў прасякнуты аптымізмам, а я ўжо так стамілася, не, не ад змаганьня, а ад нейкай безвыходнасьці, што твой прыўзьняты настрой мяне зьдзівіў. Хоць сама я дзеўка жывая, але і ў мяне бываюць правалы.

Для мяне жыцьцё губляе сэнс, калі ў ім няма звычайнага, простага і таго вялікага чалавечага каханьня, веліч якога залежыць ад велічы духу дваіх закаханых. Неяк у маім жыцьці мне яшчэ не сустрэўся такі мужчына, які здатны быў бы перагрызьці за мяне горла ворагу. Я шукала мужыка з характарам ваўка, які шанаваў бы толькі сваю ваўчыцу. А трапляліся мне адно кабялі, што несьліся за кожнай новай спадніцаю, як за той сучкай зграя бадзяжных сабак. Таму нікому я ўжо ня веру. Усе нечага хочуць ад цябе, ды ніхто ня здольны на ахвяру дзеля каханьня. І шкада мне было свайго белага цела, каб качалі яго дзеля жарсьці звычайнай. А гады ідуць! Усё думаю, што дзеўка, а ўжо пяць унукаў у вочы глядзяць! Яшчэ й не жыла, не адкахала, а ўжо й няма калі, ды й няма з кім. А гады — не мэдаль, а бясспрэчны факт!

І таму часта, калі душа рвалася ад адчаю на шматкі, даводзілася мне весяліць іншых людзей, сваіх сяброў-прыяцеляў. І чым больш сьмяротны боль пёк грудзі, тым больш я сьмяялася. Таму й лічаць мяне вясёлай дзеўкай-бабай. Хоць ад прыроды я й сапраўды аптымістка ды весялуха. У песьнях, працы, сьвятах, сярод маіх дзяцей і сяброў я сапраўды весялілася шчыра, але скруха ў вачох, калі б хто ўважлівей паглядзеў, не праходзіла ніколі. Ну ды хопіць пра сумнае! Толькі заўважу, што слушна нехта сказаў: самая доўгая адлегласьць тая, якую ня хочацца пераадольваць, а самы страшны стан — адзінота!..»

Б'юць і п'юць

Дзесьці праз тыдні два пасьля 17 кастрычніка, пасьля «ўрокаў Пуліхава», зайшлі мы з Лаціначкай у «Прадукты», што на праспэкце імя Скарыны, паміж рэдакцыяй «Вячэрняга Менску» і аддзелам адукацыі Савецкага раёну сталіцы. У тым падвальчыку спадзяваліся мы наш добры настрой замацаваць якім-небудзь напоем у разумных дозах. Але мянты ўсё сапсавалі. Не, яны не заляталі ў бар, ня клалі наведнікаў фізіяномімі на падлогу і да сьцяны з рукамі за галаву ня ставілі. Яны сядзелі ў кампаніі цывільных і спакойна папівалі гарэлку — два мянты ў форме і з дубінкамі. ■



ДА ЧАГО ПРЫВОДЗІЦЬ ПАТУРАНЬНЕ ДЫКТАТАРАМ

Вынікі Стамбульскага саміту АБСЭ

Сямён ШАРЭЦКІ,
Старшыня Вярхоўнага Савету Беларусі

Кажуць, чалавецтва разьвіваецца па сьпіралі, і на новым вітку ўсё паўтараецца. Шматлікія прыклады з нашага жыцьця пацьвярджаюць гэта.

У верасьні 1938 году на канфэрэнцыі ў Мюнхене, у якой узялі ўдзел прэм'еры Францыі і Англіі Даляд'ё і Чэмбэрлен, верхаводы фашыстоўскіх Нямеччыны і Італіі Гітлер і Мусаліні, а таксама дэлегацыя Чэхаславаччыны, былі задаволеныя патрабаваньні Гітлера аб новым пашырэньні тэрыторыі Трэцяга Райху. (Першае такое пашырэньне адбылося ў сакавіку 1938 г. за кошт далучэньня Аўстрыі.) На гэты раз было вырашана перадаць Нямеччыне Судэцкую вобласьць, што належала Чэхаславаччыне. Прычым у апошняй згоды не пыталіся. Яе дэлегацыя прысутнічала толькі для таго, каб заслухаць прысуд «магутных сьвету». І ўсё гэта рабілася з маўклівае згоды Лігі Нацыяў, створанай у 1919 годзе з мэтаю абмежаваньня зброі, узаемнай гарантыі тэрытарыяльнай цэласьці і незалежнасьці членаў Лігі, барацьбы з агрэсарамі. Нямеччына пакінула Лігу яшчэ ў кастрычніку 1933-га. Каб ня зьвязваць сабе рук.

Калі кіраўнікі дзяржаваў вярнуліся дамоў, і ангельцы запыталіся ў 69-гадовага і вельмі асьцярожнага кіраўніка свайго ўраду, якія навіны ён прывёз зь Мюнхена, Чэмбэрлен іх запэўніў: «Я прынёс мір нашаму часу».

Узрушаны гэткай палітыкай патураньня агрэсару Чэрчыль сказаў: «Гэта толькі пачатак расплаты. Гэта толькі першы глыток з горкае чары, якая будзе прапанаваная нам з дня на дзень».

Пасьля «Мюнхенскай згоды» быў «пакт Молатава—Рыбэнтропа», у часе падпісаньня якога яшчэ адзін дыктатар — Сталін — прапанаваў падняць келіх шампанскага за здароўе Гітлера як лідэра, быццам бы падтрыманага большасьцю нямецкага народу. Два дыктатары ўступілі ў змову і падзялілі між сабою сфэры ўплыву ў Эўропе.

Чым скончылася тагачасная палітыка «прымірэньня» з дыктатарамі і задавальненьня іхных патрабаваньняў, добра вядома.

Чым скончылася мюнхенская палітыка «прымірэньня» з Гітлерам, добра вядома. Нешта падобнае адбываецца і ў нашы дні. Стамбульскі саміт кіраўнікоў дзяржаваў не надаў належнае ўвагі правам народаў на стварэньне і захаваньне сваіх дзяржаваў.

Нешта падобнае, толькі на новым вітку сьпіралі, адбываецца і ў нашы дні. Сьведчаньне таго — радасьць шавіністычных колаў Расеі, зь якой яны ўспрымаюць кожнае паведамленьне пра захоп усё новых населеных пунктаў Чачэніі. Гаворка ідзе не пра барацьбу з бандытамі. Кожны сумленны чалавек падтрымліваў бы такую барацьбу, якой бы нацыянальнасьці бандыты ні былі. Гаворка ідзе пра той экстаз шавіністычных пачуцьцяў, што выказваюцца ў расейскіх СМІ з нагоды, скажам, адкрыцьця новых расейскіх школаў у захопленых чачэнскіх сёлах, дзе чачэнская мова вывучаецца толькі як прадмет.

Расейскія вайскоўцы і карэспандэнты ў Чачэніі прыдумалі нават слова «зачыстка». Калі яно азначае зачыстку краіны ад роднай мовы, ад нацыянальных традыцыяў і звычаяў, дык гэта і ёсьць аднаўленьне таго самага махровага шавінізму, што праводзіўся ў часы Расейскай імпэрыі і яе пераемніка — Савецкага Саюзу. Сусьветная практыка паказвае, што кожны народ, каб быць абароненым ад шавінізму тытульнай нацыі, імкнецца мець сваю нацыянальную дзяржаву. На гэта ён мае права і за гэта ён будзе змагацца, бо без стварэньня нацыянальнай дзяржавы нельга ў поўнай меры захаваць і правы чалавека. І таму вельмі шкада, што правам народаў на стварэньне і захаваньне сваіх нацыянальных дзяржаваў Стамбульскі саміт кіраўнікоў дзяржаваў не надаў належнае ўвагі.

Беларуска-Расейскі саюз — «пакт Молатава—Рыбэнтропа».

Экстаз шавіністычных пачуцьцяў у дзеяньні — гэта і ёсьць агрэсія супраць іншых народаў, пад якім прыкрыцьцём яна б не ажыцьцяўлялася: ці пад прыкрыцьцём абароны правоў этнічных немцаў, як гэта было ў часе захопу Гітлерам Судэцкай вобласьці, ці пад прыкрыцьцём барацьбы з бандытамі, як гэта сёньня адбываецца ў Чачэніі.

Не прыкмеціў Стамбульскі саміт і тых парушэньняў правоў і свабодаў чалавека, якія сёньня маюць месца ў Беларусі. Больш за тое, у выніковай дэклярацыі гаворыцца нават пра нейкі першапачатковы прагрэс у Беларусі ў справе палітычнага дыялёгу зь непасрэдным удзелам АБСЭ.

Цяжка сказаць, чым гэткі запіс прадыктаваны: ці тым, каб паказаць, што прадстаўніцтва АБСЭ ў Беларусі і рабочая група АБСЭ па Беларусі нешта сапраўды могуць, і іх захады эфэктыўныя, ці тым, што паводле парадку прыняцьця пастановаў (кансэнсус мінус адзін голас), АБСЭ ўвогуле ня можа прымаць больш канкрэтных рашэньняў. Так ці інакш, а прыняты пункт па Беларусі нікога ні да чаго не абавязвае і ставіць на адну дошку як тых, хто парушае законнасьць, правы і свабоды чалавека, так і тых, чые правы парушаныя і хто вядзе барацьбу за ўсталяваньне законнасьці. Гэткі абцякальны запіс зьяўляецца амаральным у адносінах да тых, хто сёньня па палітычных матывах падвяргаецца рэпрэсіям, бязь вестак прапаў, абылганы ў дзяржаўных СМІ і пазбаўлены права сябе абараніць.

Няўжо тыя, з чыёй прапановы рабіўся гэткі запіс, ня ведаюць, што як у трыццатыя гады ўсьлед за «Мюнхенскай згодай» быў падпісаны ў Маскве «пакт Молатава—Рыбэнтропа», так і сёньня за Стамбульскай дэклярацыяй, якая сваім зьместам патурае расейскаму шавінізму і дыктатарскаму рэжыму ў Беларусі, адбудзецца ва ўсё той жа Маскве, за сьпінамі народаў Беларусі і Расеі, падпісаньне новага злачыннага пакту, які пры яго ажыцьцяўленьні пазбавіць беларускі народ права мець сваю нацыянальную дзяржаву. Яшчэ «дамова» не падпісаная, а ўжо ва ўгоду расейскім шавіністам дыктатарскі рэжым Лукашэнкі зьліквідаваў у сталіцы Беларусі ўсе беларускія школы, амаль не выдаюцца беларускія кнігі, гвалтоўна выцясьняецца беларуская мова, робіцца ўціск на нацыянальныя меншасьці, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі. Беларускую культуру, навуку і асьвету ў Савеце Міністраў курыруе пал-

Беларусы памятаюць подзьвігі Тадэвуша Касьцюшкі і Кастуся Каліноўскага, і калі іх вымусяць, яны будуць гатовыя іх паўтарыць.

коўнік, грамадзянін Расеі Ў.Замяталін, людзі, якія прыбылі з Масквы, узначальваюць Міністэрства замежных справаў і Міністэрства абароны Беларусі і г.д. А што будзе пасьля падпісаньня «дамовы»?

Для абгрунтаваньня інкарпарацыі Беларусі ў склад Расейскай Фэдэрацыі выкарыстоўваюцца ўсё тыя ж злачынныя мэтады, якія выкарыстоўваліся ў часе намоцтваў А.Лукашэнкі скончыўся 20 ліпеня 1999 году і ўсе ягоныя подпісы на дзяржаўных дакумэнтах ня маюць сілы. І гэтага «не заўважыў» Стамбульскі саміт кіраўнікоў дзяржаваў-членаў АБСЭ.

Вядома, што беларускі народ (асабліва моладзь) не пацерпіць глумленьня над яго правам мець свой родны дом — сваю нацыянальную дзяржаву і будзе абараняць гэтае права ўсімі сродкамі, у тым ліку і са зброяй у руках, калі яго да гэтага прымусяць. «Аб'яднальнікам» трэба было б памятаць урокі гісторыі, якія сьведчаць, што ўсе гады знаходжаньня Беларусі ў складзе Расейскай імпэрыі — гэта гады пэрыядычных паўстаньняў і барацьбы беларусаў за аднаўленьне сваёй дзяржаўнасьці. Беларусы памятаюць подзьвігі Тадэвуша Касьцюшкі і Кастуся Каліноўскага, і калі іх вымусяць, яны будуць гатовыя іх паўтарыць.

Тым жа, хто сёньня патурае дамаганьням расейскіх шавіністаў і недаацэньвае тую пагрозу міру, якую нясе ў сабе новая дыктатарская плынь — «лукашызм», хачу задаць пытаньне: няўжо вы думаеце, што папярэджаньні Чэрчыля ўжо састарэлі, і на гэты раз можна задаволіць шавіністаў і дыктатараў нейкімі падачкамі, пасьля чаго яны супакояцца? А калі не, дык чым скончыцца патураньне ім на гэты раз?.. ■

ЧЫТАЧАМ «НН», ЯКІЯ КУПЛЯЮЦЬ ГАЗЭТУ Ў «БЕЛСАЮЗДРУКУ»

Шаноўныя людзі!

Вельмі просім: калі Вы купляеце газэту штотыдня, дык, калі ласка, замест гэтага падпішыцеся на «Нашу Ніву». Вам гэта выйдзе яшчэ таньней, а мы, калі стане болей падпісчыкаў, зможам ужо на пачатку 2000 году перайсьці з 12 да 16 старонак штотыднёва. Вось чаму: продаж празь «Белсаюздрук» выходзіць для газэты стратным, а падпіска прыносіць прыбытак (хоць для Вас падпіска таксама абыдзецца таньней, чым набываць у кіёску). Бо калі прадаюць газэту ў шапіку, дык 40% кошту «Белсаюздрук» бярэ сабе, а рэшту грошай нам вяртае толькі праз 3 месяцы. І мы ня маем, як разьвівацца.

Дык падпішыцеся, калі ласка (да 10 сьнежня).

Раней менчукам невыгодна было падпісвацца, бо газэты прыносілі дахаты толькі ва ўторак, а ў шапіку можна было набыць ужо ў панядзелак, але цяпер вельмі выгодная й дужа танная ёсьць падпіска на шапік, калі газэту забіраеш у шапіку (хочаш — у панядзелак, хочаш — калі хочаш). Гэта вельмі зручна і для тых, хто жыве ў інтэрнатах. Пра гэтую падпіску мы тут у газэце паведамляем і даем сьпіс шапікаў.

Заадно даем Вам знаць, што мы ўжо з наступнага году будзем выходзіць штотыднёва, безь перапынку, а не 4 разы на месяц, як цяпер.

Вельмі важна для нас, каб Вы падпісаліся. Ну, а калі няма цяпер грошай, купляйце так. Беларусь мяняецца, «Наша Ніва» застаецца.

Рэдакцыя

Ідзе падпіска на «Нашу Ніву» на 2000 год:

Падпіска звычайная:
на 1 месяц — 256 000 руб.
на 3 месяцы — 768 000 руб.
на 6 месяцаў — 1 536 000 руб.

Для менчукоў падпіска «да запатрабаваньня» (каб забіраць нумар у шапіку «Белсаюздруку» ў дзень выхаду газэты — гэтая падпіска прымаецца да 20 дня перадпадпіснога месяца):
на 1 месяц — 236 000 руб.
на 3 месяцы — 708 000 руб.
на 6 месяцаў — 1 416 000 руб.

Падпісны індэкс 63125.
Нас цяжка купіць у «Белсаюздруку».

НАША НІВА

Ніжэй мы падаем сьпіс пунктаў, дзе можна падпісацца й забіраць газэту:

1. Кастрычніцкі пункт падпіскі	вул. Жукоўскага, 5, к. 1	17. Крама № 14	вул. Валадарскага, 22	33. Шапік №2	Лінгв. унів-т, вул. Захарава, 21
2. Партызанскі пункт падпіскі	вул. А.Кашавога, 8	18. Крама № 15	вул. Танкавая, 16	34. Шапік №16	Гатэль «Сьвіслач», вул. Кірава, 13
3. Першамайскі пункт падпіскі	пр. Ф.Скарыны, 113	19. Крама № 16	вул. В.Харужай, 24	35. Шапік №18	Тэхн. унів-т, вул. Сьвярдлова, 13/4
4. Фрунзенскі пункт падпіскі	вул. Рам. Слабада, 9	20. Крама № 17	вул. Няхрасава, 35	36. Шапік №37	Дом Ураду, вул. Савецкая, 11
5. Крама № 1	вул. Жукоўскага, 5	21. Крама № 18	ст. м. «Плошча Перамогі»	37. Шапік №38	Пэдаг. унів-т, вул. Савецкая, 18
6. Крама № 2	пр. Ф.Скарыны, 44	22. Крама № 19	пр. Машэрава, 51, к. 1	38. Шапік №40	Менгарвыканкам, пр. Ф.Скарыны, 8
7. Крама № 3	пр. Ф.Скарыны, 76	23. Крама № 20	вул. Ясеніна, 16	39. Шапік №88	Менаблвык-м, вул. Энгельса, 4
8. Крама № 4	вул. Леніна, 15	24. Крама № 21	станцыя мэтро «Пушкінская»	40. Шапік №95	вул. Мясьнікова, 39
9. Крама № 6	вул. Філімонава, 1	25. Крама № 23	вул. Славінскага, 39	41. Шапік №198	Эканамічны унів-т
10. Крама № 7	вул. Якуба Коласа, 69	26. Крама № 24	вул. Жылуновіча, 31	42. Шапік №209	МАЗ, вул. Сацыялістычная, 2
11. Крама № 8	вул. Сурганава, 40	27. Шапік № 34	гатэль «Менск», пр. Ф.Скарыны, 11	43. Шапік №228	Унів-т культуры, вул. Рабкораўская, 17
12. Крама № 9	пр. Ракасоўскага, 140	28. Шапік № 136	ст. м. «Пл. Я.Коласа», выхад да Ак. Ф-ры	44. Шапік №232	МЗХ, пр. Машэрава
13. Крама № 10	вул. Асіпенкі, 2	29. Шапік № 187	гатэль «Беларусь», вул. Старажоўская, 15	45. Шапік№243	Саўмін, вул. Савецкая, 9
14. Крама № 11	пр. Пушкіна, 77	30. Шапік № 262	гатэль «Плянэта», пр. Машэрава, 31	46. Шапік №245	Бальніца хут. дапамогі, вул. Кіжаватава, 56
15. Крама № 12	вул. Кіжаватава, 80	31. Шапік № 78	гатэль «Юбілейны», пр. Машэрава, 19	47. Шапік №298	пр. Машэрава, 75/1
16. Крама № 13	вул. Каліноўскага, 82, к. 2	32. Крама №25	вул. К.Маркса, 21	48. Шапік №302	9-я бальніца

спорт

ЛУКАШЭНКА НЯ ДАЎ БАСКЕТБАЛІСТАМ ТРЭНІРАВАЦЦА

Яны прайгралі палякам 76:81

Сустрэчы папярэднічала пара канфузаў. Спачатку палякаў, якія прыляцелі на папярэднія гульні, больш за дзьве гадзіны пратрымалі ў аэрапорце «Менск-2», знайшоўшы быцам нейкія недахопы ў дакумэнтах. Пасьля, у дзень гульні, беларускія баскетбалісты, якія прыехалі на раніцнюю трэніроўку, не маглі трапіць у Палац — дзьверы былі блякаваныя ланцугом амону. На малой арэне Палацу гуляў у хакей Лукашэнка з кампаніяй. На довады «мы баскетбалісты» ахова не рэагавала.

Праз паўгадзіны баскетбалістаў нарэшце пусьцілі. Таксама з-за Лукашэнкі на 3 гадзіны адцягнулі продаж квіткоў у касах Палацу спорту, і пары дзясяткаў балельшчыкаў давялося памерзнуць.

Сам жа матч атрымаўся досыць цікавы. Беларусы 30 з 40 хвілінаў вялі ў ліку, але пад канец стаміліся і прайгралі, што засмуціла 3000 балельшчыкаў, якія добра крылі матам нашых легіянэраў, выходзячы з залі.

Аляксей Шыдлоўскі



Фота IREX-ProMedia

Нумар 10 — лідэр беларускай зборнай Аляксандар Куль

БАСКЕТБОЛ. АДБОР НА ЧЭМПІЯНАТ ЭЎРОПЫ-2001

Права выступаць на будучым чэмпіянаце Эўропы ў Турцыі ўжо атрымалі 8 зборных: гаспадары турніру, а таксама 7 лепшых (Літва, Італія, Гішпанія, Югаславія, Францыя, Расея й Нямеччына). Астатнія 8 месцаў разыграюць яшчэ 24 зборныя, разьбітыя на 4 падгрупы. Беларусь трапіла разам з камандамі Чэхіі, Грэцыі, Польшчы, Эстоніі і Аўстрыі. Фаварытамі выглядаюць Грэцыя й Чэхія. Польшчу і Эстонію можна назваць камандамі прыблізна такога ж роўню, як наша. Менавіта зь імі Беларусь правядзе самыя цікавыя гульні.

Заняць у такой кампаніі 2-е месца будзе для нашых праблематычна. Асабліва пасьля двух "абаранкаў" на старце. Паразу ў гасьцёх ад Чэхіі можна было прадказаць: беларусы сабраліся толькі за пару дзён да старту і не правялі ніводнага сур'ёзнага спарынгу, проста не пасьпелі аднавіць гульнявыя сувязі. Да таго ж адзіны наш цэнтравы Аляксандар Куль (ён выступае за аўтсайдэра турэцкага чэмпіянату "Камбасан") відавочна прайграе чэскаму цэнтравому Зідэку, які пасьпеў пагуляць у NBA. А ў баскетболе наяўнасьць у камандзе высакакляснага цэнтру азначае палову посьпеху. Зідэк і стаў героем той сустрэчы, набраўшы 29 ачкоў (супраць 20 у Куля). Гульня ж са зборнай Польшчы паказала, наколькі далёка мы апусьціліся за апошнія гады.

Нашу каманду падвяла непрэстыжнасьць сёньняшняй беларускай зборнай у вачох некаторых баскетбалістаў. Ужо пару гадоў адмаўляецца выступаць за зборную лепшы беларускі баскетбаліст 90-х Валеры Дайнэка (тлумачачы гэта стомленасьцю ад савецкага бардаку, які пануе ў нашай баскетбольнай фэдэрацыі). Плюс Каранкевіч пнецца выступаць за Расею (а якраз пазыцыя "цэнтру" самая слабая ў нашай камандзе: апроч Куля няма нікога). Гэта таксама вынікі таго разбурэньня нацыянальнай сьвядомасьці, якога дабіваецца цяперашні ўрад.

У гэтым годзе нашую каманду чакае яшчэ толькі адна гульня — з грэкамі. Ня выйграюць нашы, дык хоць пракатаюцца: гуляць будуць у Атэнах.

Андрэй Андрыеўскі

дзе варта быць

«Наша Ніва» і «Arche»

«Наша Ніва» і **«Arche»** запрошаныя на сустрэчу ў Кальварыйскую раду Маладога Фронту. Да чытачоў у пятніцу 3 сьнежня а 19-й прыйдуць Валерка Булгакаў і Андрэй Дынько. Кальварыйская рада месьціцца на Захадзе. Як дабірацца, можна даведацца праз тэлефон 253-03-14 (Алесь Барбікаў).

Горадня

5—6 сьнежня ў кінатэатры «Горадня» пройдзе **рок-фэст «Тры шрубы»** з удзелам «Кальяну», «Hollowed»-у, «Старога млыну» і іншых групаў.

Кіно

У Палацы культуры прафсаюзаў у Менску на гэтым тыдні пакажуць колькі стужак рэжысэра **Клода Шаброля**. Праграма называецца **«Бунтаўнік спакою»**. 1 сьнежня на экране **«Зух Сэрж»** (1959) — адзін з праграмных фільмаў кіно новай хвалі. 2-га — **«На два павароты»**, крымінальная драма. 3-га — **«Хай здохне зьвер»**, фільм пра жорсткасьць ды гвалт. 7-га — **«Цырымонія»** (безь перакладу), экранізацыя крымінальнага раману Рут Рэндал, дэталёвае дасьледаваньне анатоміі зла. 8-га — **«Бэты»**, экранізацыя псыхалягічнага раману Жоржа Сымэнона. Бэты — самотная паўп'яная жанчына ў начным бары, у глыбіні душы якой — цёмныя жаданьні ды рызыкоўныя эратычныя фантазіі. 9-га — **«Стаўкі зробленыя»**, крымінальны фільм зь нестандартнай інтрыгай і цудоўнай акторскай працай Юпэр і Сэро.

Спорт

«Gallina Blanca», фірма, што ўпарта вядзе сваю рэклямную кампанію па-беларуску, на гэты раз фундуе **кубак Беларусі па спартыўнай гімнастыцы**, які пройдзе ў Палацы спорту. 3 сьнежня ў 15.30 адбудзецца фінал спаборніцтваў (шматбор'е); 4-га у 10.30 — **«Baby Cup»** (выступленьні самых маленькіх спартоўцаў), а ў 15.30 — фінал у асобных відах гімнастыкі; 5-га — шоў зорак сусьветнай гімнастыкі (білетам служыць упакоўка супу фірмы).

ART

Ёсьць адно пацьверджанае жыцьцём правіла — ня варта марнаваць час і грошы на антрэпрызы, прывезеныя да нас з расейскіх сталіц. Бо ні ў Маскве, ні ў Піцеры гэтыя спэктаклі не паказваюцца. Яны створаныя адмыслова для недалёкіх правінцыялаў, гатовых плаціць за «кіношныя» імёны. Але здараюцца выняткі. А 19-й на сцэне дому Афіцэраў пачнецца **спэктакаль «АРТ»**, пастаўлены французскім рэжысэрам Патрысам Кербратам з удзелам артыстаў І.Касталеўскага, М.Янушкевіча й М.Філіпава. Білеты каштуюць ад 1500 да 7500 тыс. рублёў.

Трышчан і Іжота

1 сьнежня на Малой сцэне Купалаўскага **прэм'ера «Трышчана і Іжоты»**, новага спэктаклю, пастаўленага Гарцуевым паводле п'есы Сяргея Кавалёва. Мабыць, нейкая цікавінка будзе ў гэтым, бо іграюць збольшага маладыя акторы, выпускнікі Акадэміі мастацтваў, і ў спэктаклі шмат харэаграфіі.

Коласаўцы

На гэтым тыдні купалаўцам давядзецца пацясьніцца, бо ў Менск прыяжджае з гастролямі **віцебскі тэатар імя Якуба Коласа.** 1 сьнежня на сцэне Купалаўскага — саната ў дзьвюх дзеях **«Пад сонцам»**; 2-га — трагікамэдыя А.Паповай **«Таму што люблю»**; 3-га — драма А.Стрындбэрга **«Фрэкен Юлія»**; 4-га — шоў-опэра паводле А.Пушкіна **«Руслан ды Людміла»**; 5-га — **«Блудны муж і яго жонка Варвара»** — камэдыя без антракту, створаная Г.Марчуком. На Малой сцэне 3-га віцябляне паказуць спэктакаль **«Шагал... Шагал...»**

Зьніч

30-га ў Касьцёле сьвятых Сымона і Алены **«Зьніч»** — беларускі паэтычны тэатар 'аднаго актора ладзіць монаспэктакаль **«Віленскія мроі»** паводле ўспамінаў Юльяны Вітан-Дубейкаўскай з роду Мэнке.

БТ

У панядзелак увечары ў праграме **«Добры вечар, Беларусь»** будуць гаварыць пра **захаваньне архітэктурных помнікаў.** Мо й Вам ёсьць што сказаць? У студыю можна будзе патэлефанаваць.

Арт-кавярня

2 сьнежня ў арт-кавярні ў Палацы культуры трактарнага (ля мэтро «Трактарны завод») пройдзе **літаратурна-мастацкая вечарына.** Чакаецца ўдзел паэта **Славаміра Адамовіча.** Пачатак а 19-й.

Духавая музыка

3 і 4 сьнежня а 19-й у Палацы культуры МТЗ выступіць духавы аркестар **«Няміга».** Вядучым будзе аўтар **«НН» Зьміцер Падбярэскі.**

Алесь Кудрыцкі

МАСТАЦТВА З «АСАБЛІВЫМ ЦЫНІЗМАМ»

Няясна, чаго было болей у судзе над Алесем Пушкіным — правасудзьдзя або мастацтва

Пачалося ўсё з таго, што судзьдзя Хрыпач не хаваў натуральнага разуменьня беларускай мовы і не шукаў ніякіх перакладчыкаў. І ўсё ж за карэктнасьцю судзьдзі праглядалася перадвызначанасьць выніку — тая сабе незалежнасьць, калі ад чалавека «нічога не залежыць». Што да старэнькіх дзядка з бабулькай паабапал судзьдзі Хрыпача, дык я так і не змагла растлумачыць ролю гэтых жывых дэкарацыяў замежным журналістам.

Алесь Пушкін абвінавачваўся ў тым, што, праяўляючы асаблівы цынізм, знаходзячыся ля 1-га пад'езду рэзыдэнцыі прэзыдэнта, дэманстратыўна прыкаціў вазок з гноем, пад якім, паводле абвінавачаньня, ляжалі герб, сьцяг і партрэт Лукашэнкі: у «злосным хуліганстве» і «зьнявазе дзяржаўных сымбаляў».

Алесь Пушкін адзначыў, што, выказваючы пратэст ад імя грамадзтва, ня меў на мэце абразіць пачуцьці людзей, але прызнаўся: у бліжэйшую пасьля 21 ліпеня нядзелю наведаў царкву ў сваім Бабры ды спавядаў там грэх «змушчэньня сэрцаў». Грэх, на ягоную думку, быў у тым, што ля вазка з гноем маглі сабрацца прыхільнікі і апанэнты Лукашэнкі ды, крый Божа, учыніць патасоўку між сабою. «Почырк беларускай апазыцыі — гэта ня кроў, не вайна, а змаганьне такімі мірнымі высокамастацкімі акцыямі», — упэўнены Алесь.

Сьведкамі на судзе былі два маладыя міліцыянты, якія 21 ліпеня несьлі службу аховы «Чырвонага Дому». Цікава, што спачатку ахоўнікі будынку заўважылі зусім не мастака з вазком ды вілкамі, а групу журналістаў з фота- і відэакамэрамі. Абодва сьведкі заявілі, што ня бачылі дакладна, у што менавіта Пушкін утыкнуў вілкі, калі спыніў вазок.

Суд адхіліў хадайніцтва абароны аб прызначэньні мастацтвазнаўчай экспэртызы, тым ня менш, судовая калегія дапытала ў якасьці спэцыяліста мастацтвазнаўцу Віктара Пятрова. Пушкінскую акцыю ён ацаніў як «пэрформанс з палітычным падтэкстам», заявіўшы, што спрэчным у гэтым выпадку можа быць толькі ўспрыманьне акцыі рознымі гледачамі.

На жаль, судзьдзя Хрыпач сарваў цікавы сюжэт для праграмы «Времечко». Здымачнай групе расейскага НТВ з самага пачатку працэсу былі забароненыя здымкі.

Алесь Пушкін быў прызнаны вінаватым і асуджаны на 2 гады турмы з адтэрміноўкай выкананьня прысуду на такі ж тэрмін.

Напярэдадні суда над мастаком пачалі адбывацца містычныя рэчы зь некаторымі ягонымі творамі. Абразы маці Божай усіх смуткуючых радасьці і Хрыста Ўседзяржыцеля, якія Пушкін рэстаўраваў у адной з цэркваў Віцебску, пачалі міраточыць. Расейскія сьвятары, кажа Алесь, расцанілі гэта па-свойму: маўляў, «Александр выступает против власти, и господь должен его образумить». РПЦ у Віцебску моліцца за Пушкіна.

А пра Алесеў росьпіс у менскім ліцэі мастацтваў ужо ходзіць цэлая легенда. Яе распавёў мне адзін з выкладчыкаў, які чуў тую легенду ад сваіх вучняў. Кажуць, што, калі Пушкін працаваў над росьпісам у актавай залі, у яго ня ладзілася праца — ажно пакуль у апошнюю ноч перад здачай работы не сышоў на мастака нібы Дух, і карціна на сьцяне сама сабой намалявалася. Пазьней ля яе фатаграфаваліся вучні. Але аднойчы высьветлілася незразумелае: адзін з пэрсанажаў карціны, хлопчык-музыка са скрыпкаю ў руках, кожнага разу на здымках стаіць у іншым месцы!

Ня ведаю, ці бачыў падобныя містычныя знакі расейскі цёзка нашага мастака. Але ж і яму ўлады адказвалі на мастацтва перасьледам ды высылкаю. У нашага Пушкіна гэта ўжо другі крымінальны прысуд за палітыку. Першы раз яго судзілі яшчэ камуністы.

Тацяна Сьнітко

Фота IREX-ProMedia

Ля прэзыдэнцыі 21 ліпеня 1999 году



Фота АР

ШКАДА РАСЕІ

Працяг са старонкі 1.

Асьвятленьне вайны ў замежных мас-мэдыях абвяшчаецца аднабокім толькі таму, што інфармацыя падаецца з абодвух бакоў чачэнскага фронту (НТВ у іншым кантэксьце трапна назвала закіды такога кшталту "абвінавачваньнямі ў прафэсіяналізме"). Тым часам наступ інфармацыйнай дыктатуры ў Расеі робіць немагчымым выказваньне адрознай думкі, дый увогуле думкі. Дужа папулярнага цяпер Пуціна не насьмельваецца крытыкаваць ніхто, і нават расейскія "заходнікі" лісьлівяць перад новым народным улюбёнцам, прынамсі, на словах.

У Львове ня любяць расейцаў, у Менску паляць расейскія сьцягі, у Балтыі ладзяць набор добраахвотнікаў на змаганьне з фэдэраламі і г.д. — і сярод гучнага й гнеўнага абурэньня ў расейскіх СМІ нікому не прыходзіць на думку простае пытаньне: чаму? Адмоўныя героі гэтых сюжэтаў, нібы казачныя пэрсанажы, якія чыняць зло толькі таму, што ад прыроды злыя і ня любяць Расеі, як тая Баба Яга (чую, чую рускі дух!). Ніхто не спрабуе растлумачыць, знайсьці крыніцу антырасейскіх настрояў у былых «братніх рэспубліках» і ў сьвеце. Расейская замежная палітыка, ад царскай да ельцынскай, не падлягае сумневу. Варта адно намякнуць на магчымасьць памылкі — можа, мы нешта ня так зрабілі? — каб атрымаць ярлык "здрадніка", што й здарылася зь Яўлінскім, які наважыўся загаварыць пра мір з Чачэняй.

Ёсьць два спосабы канца разьвязаць "чачэнскае пытаньне". Першы: зьнішчыць усіх чачэнцаў. Улучна зь дзецьмі, бо яны калісьці вырастуць, жанчынамі, бо яны народзяць новых дзяцей, і старымі, бо яны распавядуць малым. Другі: пакінуць Чачэнію ў спакоі і ўмацаваць расейска-чачэнскую мяжу. Гэты другі варыянт ня толькі больш цывілізаваны і прасьцейшы, ён адзіна рэальны. Вайна, як сьведчыць гісторыя, не вынятак, а хутчэй нармальны стан расейска-чачэнскіх дачыненьняў у апошнія паўтараста гадоў, ад моманту зьяўленьня там першага расейскага салдата.

Але расейскія кіраўнікі дураць галовы сваім падданым, ня думаючы пра будучыню краіны далей за чэрвень 2000 году, калі маюць адбыцца прэзыдэнцкія выбары. Ім напляваць на чарговае страчанае пакаленьне, напляваць на міжнародную рэпутацыю Расеі ды вялізныя выдаткі на вайну, а на чачэнскі народ — пагатоў. Іх высокая мэта — улада — апраўдае любыя выдаткі й сродкі, і найлепшым сродкам для здабыцьця папулярнасьці ў краіне выявілася вялікадзяржаўнасьць. Відаць, гордасьць за вялікую радзіму добра суцяшае ў галечы.

Шкада Чачэніі, але шкада й Расеі. Мы добра ведаем, што такое папулізм. Калі Беларусь стала ахвяраю таннага папулізму, дык Расея зараз зазнае папулізм дарагі, бо ён ужо цяпер каштуе жыцьцяў.

Алесь Пяткевіч

ТРЭЦІ ЭТАП ГЕНАЦЫДУ

Падыходзіць да завершаньня распрацоўка трэцяга этапу «антытэрарыстычнай апэрацыі» расейскіх войскаў у Чачэніі, заявіў у пятніцу першы намесьнік начальніка Генштабу Расеі Валеры Манілаў. Між тым, другая фаза генацыду чачэнскага народу канчаецца пад шалёнае рыкаценьне самалётаў і сьвіст ракетаў, пры дапамозе якіх расейцы пасьпяхова ператвараюць Грозны ў бязьлюдныя руіны.

Па словах генэрала з характэрным прозьвішчам, апэрацыя па «вызваленьні Грознага» працякае ў згодзе з планам: для чачэнскай сталіцы ноч на 26 лістапада сталася самай забойчай ад пачатку баявых дзеяньняў. У пятніцу авіяцыя фэдэральных сілаў зрабіла больш за 100 вылетаў у раён Грознага. Грозны стаўся аб'ектам так званага «дывановага бамбаваньня», факт якога ўпарта адмаўляецца расейскім камандаваньнем. Тыя, хто прыйшлі «ўсур'ёз і надоўга», зьбіраюцца «заставацца тут назаўжды», відаць, дзеля таго каб жыць у пустэльні: маштабы мэтадычнага руйнаваньня інсургенцкае рэспублікі ўзрастаюць. Посьпехі фэдэралаў відавочныя: пад іхным кантролем ўжо каля ста селішчаў. Але якім коштам здабываюцца перамогі? Нягледзячы на заявы Генштабу аб тым, што расейцы трымаюцца палітыкі «мінімізацыі ахвяраў як сярод мірнага насельніцтва, так і сярод вайскоўцаў», колькасьць ахвяраў ужо перавысіла 5 тысячаў чалавек, прычым больш за паўтысячы зь іх — расейскія салдаты.

Ня дзіва, што Расея плянуе абвесьціць амністыю для баевікоў і ўвогуле імкнецца да паступовага згашэньня, заціраньня канфлікту. Па-першае, вайна зацяглася, а ваяваць узімку расейцы, як мы памятаем, ня дужа ўмеюць. Па-другое, склалася катастрафічная сытуацыя з уцекачамі. І па-трэцяе, нягледзячы на тое, што Эўропа ў Стамбуле, хаваючы вочы за сваімі тлустымі і асьцярожнымі капіталістычнымі пальцамі, ня здолела дастаткова голасна выказаць Расеі сваё «фі», палітыкі Супольнасьці, як і ў выпадку з Косавам, прытрымліваюцца розных поглядаў на канфлікт. Аднак, відаць, такі-сякі ўціск на Крэмль вядзецца на пазаафіцыйным дыпляматычным узроўні. Асабліва рэзка выказваюцца супраць палітыкі Масквы французскія і нямецкія ўлады.

У Беларусі ж на знак падтрымкі чачэнцаў у Горадні наладзілі збор гуманітарнай дапамогі ўцекачам.

Анатоль Прасаловіч

ЦЯЖКАЯ НОШКА ДАБРАЧЫНЦАЎ

13 лістапада ў ангельскім горадзе Лідз адкрылася сустрэча прадстаўнікоў дабрачынных арганізацыяў, якія дапамагаюць Беларусі.

Сёлета прыехала больш за 100 чалавек ад дзясяткаў розных суполак. Гэткія сустрэчы склікае *Chernobyl Children Project* — вялікая аргнізацыя на чале зь Ліндай Уолкер. Гаварылі пра каардынацыю між сабою ў справе адпраўкі канвояў з грузамі ў Беларусь, пра тое, каб разам арэндаваць транспарт, а таксама, каб супольна рабіць невялікую газэту.

Зацікавіла ўсіх паведамленьне пра менскі дзіцячы госьпіс — прытулак для сьмяротна хворых. Ён існуе на грошы замежных ахвярадаўцаў. Дзяржава не дае, таму грошай госьпісу хранічна не стае, а сьмяротнікаў усё больш. Кіраўнічка госьпісу Ганна Гарчакова казала, што крытычная сытуацыя склалася ў Берасьцейскай вобласьці, дзе на рак дзеці хварэюць усё болей, а лекар для безнадзейных — адзін на ўсю вобласьць. Дык хочуць людзі заснаваць невялікія госьпісы таксама ў Берасьці ды Гомелі.

Дабрачыннасьць у Беларусі — неверагодна складаная й дарагая справа, — казалі ўдзельнікі сустрэчы. Дзяржава неахвотна дае палёгкі дабрачынцам, часта вымагае ўсякія падаткі, дзярэ грошы за ліцэнзіі. Апроч таго, у Беларусі авіяквіткі, інтэрнэт (а значыць, і электронная пошта), звычайная міжнародная пошта каштуюць шмат даражэй, як у Брытаніі — адной з дарагіх краінаў Эўропы. Грошы на дабрачыннасьць шукаць нялёгка, дык людзі й шкадуюць кожнага змарнаванага фунту.

У Брытаніі дабрачынна працуюць дзясяткі звычайных, незаможных людзей, грошы на помач Беларусі — на прыём і лячэньне дзяцей — зьбіраюць па цэрквах і нават у пабах. Увогуле брытанцы — вельмі ахвярныя людзі. Шмат чаго на ахвяраваньні робяць у сваёй краіне і шмат грошай іншым народам аддаюць.

Дабрачынцы ня радыя, што прыходзіцца супрацоўнічаць зь цяперашняй уладай РБ, некаторыя спынілі кантакты, сталі дапамагаць іншым краінам — гора ў сьвеце хапае. Але ж і ў Беларусі робіцца ўсё горш і горш. Брытанцы ведаюць, што праз дабрачыннасьць ня зьменяць на лепшае сытуацыі ў нас. Што ў сілах — выратаваць ад голаду, сьмерці, хваробаў хоць частку людзей, якія потым сваёй радасьцю, натхнёным энтузіязмам будуць дзяліцца зь іншымі. Вось і стараюцца рабіць свае добрыя справы як найлепш.

Алесь Пешчарда, Лёндан

RADIO FREE EUROPE · RADIO LIBERTY

БЕЛАРУСКАЯ СЛУЖБА РАДЫЁ СВАБОДА

Новыя хвалі ад 31 кастрычніка 1999 году

Час	*Хвалі*
18.00-19.30 *паводле менскага часу*	6000 і 6170 кгц (49 м) 7155 кгц (41 м) 9615 кгц (31 м)
22.00-23.30 *паводле менскага часу*	6010 і 6025 кгц (49 м) 6170 і 7155 кгц (41 м)
6.00-7.00 *паводле менскага часу*	5995 кгц (49 м) 7275 і 7295 кгц (41 м) 9750 кгц (31 м)

Сталая частата на сярэдніх хвалях — 576 кгц

Адрас: 220005 Менск-5, п/с 111; Vinohradska 1, Praha 110 00 CZ
Праграму можна слухаць, чытаць, а таксама пісаць у рэдакцыю праз *Інтэрнэт*
WWW.SVABODA.ORG

НАСТРОЙЦЕСЯ НА "СВАБОДУ"!

БЕЛАРУСЫ КАНАДЫ СУПРАЦЬ САЮЗУ З РАСЕЯЙ

31 кастрычніка ў Таронта адбыўся чарговы зьезд Згуртаваньня беларусаў Канады. Абмяркоўвалі новы саюз Беларусі з Расеяй і прынялі наступную рэзалюцыю:

«У абліччы таго,

— што незалежнасьць нашае Бацькаўшчыны — Рэспублікі Беларусі — знаходзіцца пад пагрозай, бо дыктатар Аляксандар Лукашэнка праводзіць працэсы «інтэграцыі» Беларусі ў суседнюю дзяржаву — Расею;

— што Аляксандар Лукашэнка імкнецца прысьпешыць працэс «інтэграцыі» Беларусі з Расеяй таму, што «старэйшае пакаленьне адыходзіць, а малодшае не падтрымоўвае ідэі злучэньня Беларусі з Расеяй». (Ягоная прамова з 14 кастрычніка 1999 году ў Калінінградзе);

— што тэкст дамовы злучэньня Беларусі з Расеяй, апублікаваны 8 кастрычніка 1999 году, прадбачвае сьпешную інкарпарацыю Беларусі ў Расею перад канцом 1999 году;

— што жыхары Беларусі, рызыкуючы сваім жыцьцём, награжаючыся на катаваньні, арышты, турмы й агромныя грашовыя штрафы, выйшлі масавай дэманстрацыяй 17 кастрычніка 1999 на вуліцы Менску пратэставаць супраць злучэньня Беларусі з Расеяй, супраць ламаньня Лукашэнкам правоў чалавека й вольнасьцяў у Беларусі;

— паводле апошніх неафіцыйных падлікаў, большасьць беларусаў ёсьць супраць злучэньня Беларусі з Расеяй;

— згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусі, якой Лукашэнка пасьля выбараў прысягаў вернасьць, ягоны пяцігодні тэрмін прэзыдэнцтва Беларусі скончыўся 20 ліпеня 1999 году, і ён болей ня ёсьць рэпрэзэнтантам народу Беларусі,

мы, удзельнікі 37-га агульнага зьезду згуртаваньня беларусаў Канады

— пратэстуем супраць дыктатарскага рэжыму А.Лукашэнкі, супраць безагляднага ламаньня правоў чалавека, супраць дыскрымінацыі ды перасьледу беларускае мовы й культуры ў Беларусі;

— мы салідарызуемся з сурдзічамі ў Беларусі ў іхным змаганьні супраць намераў былога Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі ліквідаваць незалежнасьць Рэспублікі Беларусь, супраць улучэньня яе ў другую дзяржаву — Расею;

— мы заўсёды верныя Радзе і Ўраду Беларускай Народнай Рэспублікі ў Эгзылі на чале зь яе Прэзыдэнтам спадарыняй Івонкай Сурвіллай, якая ёсьць і сяброўкай Згуртаваньня беларусаў Канады. Мы салідарызуемся з Апазыцыяй у Беларусі ў абароне дзяржаўнай незалежнасьці Рэспублікі Беларусі;

— мы падтрымоўваем Беларускую Аўтакефальную Праваслаўную Царкву зь яе Першаерархам Праасьвяшчэнным Мітрапалітам Уладыкам Мікалаем;

— мы дзякуем тым народам сьвету, якія выказваюць дапамогу беларусам у цяжкіх часох іхнае гісторыі; мы дзякуем асабліва сябрам-канадыйцам, якія ад 1989 году выказваюць так патрэбную дапамогу ахвярам Чарнобылю ў Беларусі;

— мы просім Урад Канады ды ўсе ўрады вольнага сьвету дапамагаць Беларусі стацца вольнай, незалежнай дэмакратычнай дзяржавай Эўропы».

Ад імя зьезду Згуртаваньня беларусаў Канады — Аляксандар Кот

«СЁНЬНЯ КОЖНЫ СЬВЯДОМЫ БЕЛАРУС НА ВАГУ ЗОЛАТА»

З польскім гісторыкам Ежы Клачоўскім размаўляе Сямён Букчын

Ежы Клачоўскі — заўважная постаць сёньняшняй Польшчы. Салдат Арміі Краёвай, удзельнік Варшаўскага паўстаньня ў гады вайны, актыўны дзяяч «Салідарнасьці» ад пачатку 80-х, сёньня ён дырэктар Інстытуту Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы, прафэсар Каталіцкага ўнівэрсытэту ў Любліне. Пералічыць усе яго ныя тытулы і пасады — справа складаная. Але згадаю, што ён ад 1993 г. ганаровы доктар Гарадзенскага ўнівэрсытэту. 75-гадовы вучоны надзвычай актыўны. Сярод ягоных працаў асаблівую значнасьць у навуковым сьвеце набылі творы з гісторыі хрысьціянства ў Польшчы. Для нас, безумоўна, важная цікавасьць, зь якой прафэсар Клачоўскі сочыць за падзеямі ў Беларусі. Наша гутарка адбылася ў кулюарах канфэрэнцыі, што адбылася ў Любліне да 450-х угодкаў Люблінскай Уніі.

— У выступах удзельнікаў канфэрэнцыі асабліва падкрэсьлівалася думка пра тое, што Люблінская Унія заклала падмурак сёньняшняга працэсу эўрапейскага аб'яднаньня. Ці няма тут пэўнай гіпэрбалізацыі ды рамантызацыі тых даўных падзеяў? Тым больш, што сёньняшняя Беларусь, прынамсі палітыка яе ўладаў, скіраваная якраз у адваротны бок — як мага далей ад Эўропы. Наш правіцель так і выказаўся, ён, маўляў, сваю краіну «за цывілізаваным сьветам не павядзе».

— Вы слушна аддзялілі саму Беларусь ад палітыкі яе кіраўніцтва. Сапраўды, будучыня Беларусі ў руках саміх беларусаў і нікога іншага. Я думаю, што ў вас нямала разумных людзей, што разумеюць, якую гістарычную, культурную нацыянальную спадчыну, зьвязаную з эўрапейскай традыцыяй, яны маюць. Гэтыя людзі, безумоўна, надзеленыя пачуцьцём адказнасьці за лёс свае краіны. Сапраўдныя сябры Беларусі ў Эўропе таксама добра разумеюць важнасьць беларускага ўкладу ва ўсходнеэўрапейскую культурна-гістарычную традыцыю. Безь Беларусі нельга зразумець самую сутнасьць Вялікага Княства Літоўскага. Пра гэта нельга забываць, гэта трэба захоўваць, берагчы, перадаваць дзецям і ўнукам як нацыянальны скарб. Асабліва ў цяперашніх умовах, калі кожны сьвядомы беларус літаральна на вагу золата. Болей, болей павінна ў вас быць людзей, якія сапраўды пачуваюцца беларусамі. Толькі пры такім працэсе колькасьць можа перайсьці ў якасьць.

— У нас сёньня нямала пішуць пра беларусаў як пра народ са страчанай гістарычнай памяцьцю, што толькі невялікая частка моладзі, нейкая частка інтэлігенцыі сапраўды захоўваюць цягу да нацыянальнага ідэалу. Яшчэ некалькі гадоў таму казалі пра нацыянальнае адраджэньне, але вось не атрымалася, працэс затармазіўся, калі не пайшоў назад...

— Я разумею вашыя цяжкасьці. Але ня трэба забываць, што надзвычайна важная ўмова ў цяжкія часы — захаваць і ўмацаваць нацыянальную, інтэлектуальную, грамадзкую эліту. Яе страта — гэта страта ўсяго, найперш — будучыні. Бо без эліты немагчымыя ператварэньні ані ў палітыцы, ані ў эканоміцы, ня кажучы ўжо пра культуру. І гэта важна для ўсіх народаў.

— Ведаеце, у нас неяк аддзяляюць магчымасьць прагрэсыўных сацыяльных пераменаў ад нацыянальнага моманту. Маўляў, быў бы чалавек добры...

— Важна зразумець, каго ён прадстаўляе, гэты добры чалавек. Калі толькі самога сябе, дык і сацыяльныя інтарэсы, якія ён нібыта бароніць, ня маюць яснай пэрспэктывы. Чалавек, які ведае адкуль ён родам, ня толькі ў фізычным, але, можа быць, найперш у духоўным сэнсе, можа карыстацца вялікім давер рам у грамадзтве, калі, вядома, здолее выклікаць гэты давер сваёй біяграфіяй, сваёй асобай, нарэшце.

— У асяродку беларускай нацыянальнай эліты нямала расчараваньняў, жаданьня зьехаць, эміграваць...

— Паехаць за мяжу — гэта ня самае страшнае. Галоўнае і там захоўваць сябе як беларусаў, захоўваць сваю нацыянальную адэкватнасьць.

— Сёньня ў вашай прэсе абмяркоўваецца праблема, ці можа Польшча быць прыстанкам для гнанай, выгнятанай з краіны беларускай нацыянальнай эліты...

— Мне ўяўляецца, што ў значнай ступені тут сваё слова маглі б сказаць беларусы Польшчы, якія прадстаўляюць розныя грамадзкія арганізацыі з нацыянальным ухілам. Студэнты, прагнаныя зь беларускіх ВНУ за ўдзел у палітычнай дзейнасьці, вучацца сёньня ў польскіх унівэрсытэтах. Моладзь, дзе б яна ні жыла, ні вучылася, не павінна забывацца пра свае карані. Вось чаму я яшчэ раз падкрэсьліваю важнасьць захаваньня нацыянальнай эліты. І перадусім — на глебе нацыянальнай культуры. Нацыянальныя палітыкі могуць пацярпець паразу. А нацыянальная культура заўсёды будзе заставацца глебай для новай хвалі ўздыму, адраджэньня. Бо тут нараджаецца найбольш пераканаўчая грамадзкая, сацыяльная аргумэнтацыя, якой ня мае чаго супрацьпаставіць бязродны, пазбаўлены нацыянальнага пачатку рэжым. Відавочная рэч: сёньня ўлада прайграе нацыянальным інтэлектуалам Беларусі.

— Улада, вядома, прайграе, але як прабіцца нацыянальным інтэлектуалам да замардаванай афіцыйнаю прапагандай, задуранай, саветызаванай часткі беларускага грамадзтва — вось у чым праблема.

— Гэта, безумоўна, ваша трагедыя. Тут трэба разважаць, аналізаваць... Ня можа быць гатовых рэцэптаў. Але адзін я ведаю і гатовы паўтараць бясконца: трэба захаваць нацыянальную эліту і разам зь ёй сапраўдны беларускі дух. ■

апытаньне «НН»

УСЕ, ХТО ЗМАГАЕЦЦА ЗА БЕЛАРУСЬ

Як цяперашняя вучнёўская моладзь ацэньвае стан беларускага грамадзтва і каго прызнае за нацыянальную эліту? Такое пытаньне карэспандэнт «Нашай Нівы» задаў маладым беларусам.

Ірына Віданава, галоўны рэдактар часопіса "Студэнцкая думка":

— Гэта група грамадзтва, што бярэ на сябе адказнасьць (часам падсьведама) за лёс нацыі. У Беларусі ёсьць нацыянальная эліта. Гэта частка інтэлігенцыі, гэтых людзей шмат, але яны ня моцныя ў пэўных сфэрах і ў штодзённым жыцьці сябе не выяўляюць.

Тацяна Папова, студэнтка журфаку БДУ:

— Гэта людзі, якія ёсьць носьбітамі нацыянальных вартасьцяў і традыцыяў, а найперш навукоўцы й разумныя людзі наагул. І гэта не абавязкова гуманітарыі, але галоўнае, што гэтыя людзі жывуць дзеля свае краіны. У Беларусі ўсяго 10% нацыяналістаў і гэта надта мала, але гэта эліта.

Наталя Васілевіч, студэнтка юрфаку БДУ:

— Гэта энэргічныя субпасіянарныя рэпрэзэнтанты народу, якія бароняць нацыянальныя вартасьці й займаюцца стварэньнем культурнага пласту нацыянальнае сьведамасьці. Беларуская кіраўнічая эліта насамрэч ня ёсьць нацыянальнаю, праўдзівыя ж носьбіты элітарнасьці знаходзяцца ў стане контраэліты, але менавіта яны бяруць актыўны ўдзел у фармаваньні нацыі.

Вадзім Лабковіч, былы палітвязень, цяпер студэнт Інстытуту сучасных ведаў:

— Зыходзячы з панятку "нацыя", гэта людзі, якія маюць высокі адукацыйны ровень і прысьвячаюць сваё жыцьцё паслугаваньню нацыі ды ставяць яе перадусім у сваім жыцьці. Калі гаварыць пра беларускую нацыянальную эліту, дык трэба браць пад увагу, ці ёсьць беларуская нацыя? Калі мы даем станоўчы адказ на гэтае пытаньне, дык ёсьць і беларуская эліта. Але яна падзеленая й не згуртаваная.

Алесь Мікус, рэдактар друкаванкі "Слова Нацыі":

— Гэта пласт нацыі, што грунтуецца на нацыянальных інтарэсах. Сапраўдная эліта знаходзіцца ў аніякім разе ня ў месьце, але ў вёсцы, бо менавіта вёска захавала свой адвечны тысячагадовы лад і сьветагляд. Будучая эліта мае выйсьці ня проста зь вёскі, але ўва ўсім грунтавацца на вясковым сьветаглядзе.

Югася Каляда, назвалася "юнай інтэлектуалкай і маргінальным элемэнтам":

— Нацыянальная эліта — гэта тыя людзі, якія папросту прачыталі нашмат больш кніжак за сярэднестатыстычнага чалавека й асэнсавалі іх з пазыцыі свае нацыі. Беларуская эліта глядзіць на НТВ "Кино не для всех" і шкадуе, што гэткага не здымаюць у "Беларусьфільме".

Наталя Водзіч, навучэнка Беларускага ліцэю:

— Гэта тыя людзі, якія ў складаныя часы гатовыя ахвяраваць усім дзеля выратаваньня й захаваньня нацыянальнай ідэі, мовы й культуры. У Беларусі нацыянальная эліта ёсьць, але пакуль гэтых людзей вельмі мала, марудна яны "памнажаюцца", бо няма адпаведнага выхаваньня ў школах. Я кепска знаёмая з мэтамі й плянамі Вінцука Вячоркі, але наагул для мяне эліту ўвасабляе ён.

Макс Кашынскі, прадставіўся як "дэструктар моладзевых аб'яднаньняў":

— Цяпер яе як такой няма.

Юрась Лук'янаў, супрацоўнік «Супольнасьці»:

— У Беларусі эліта толькі фармуецца, яна пачала паўставаць трохі раней за набыцьцё незалежнасьці разам зь зьяўленьнем панятку "думаць Беларусь".

Кася Бохан, студэнтка Політэхнічнай акадэміі:

Фота Анатоля Клешчука

— Гэта нешта неакрэсьленае. Тут згадваецца напаўпаказка. У вёсцы запытваюцца: "У вас у Менску ўсе па-беларуску размаўляюць?" Адказ: "У нас па-расейску размаўляць кожны бомж умее, а па-беларуску — нацыянальная эліта". Да нацыянальнай эліты я далучыла б Вінцука Вячорку, Касю Камоцкую й Васіля Быкава — імёны, што адразу прыходзяць у галаву.

Сьвятлана Судноўская, студэнтка Эканамічнага ўнівэрсытэту:

— Гэта частка грамадзтва, што можа годна рэпрэзэнтаваць нацыю ў сьвеце. Яна ёсьць у нас, бо ёсьць самое беларускае грамадзтва. У Беларусі на статус эліты можа прэтэндаваць рэдакцыя часопіса "Arche", або, напрыклад, Сакрат Яновіч, або, з палітыкаў — Вінцук Вячорка. Таксама Ўладзімер Арлоў і Алег Трусаў. Вось такога кшталту людзі.

Ірына Екадумава, маскоўская магістрантка зь Менску:

— Эліта ўяўляецца мне тымі прадстаўнікамі грамадзтва, што валодаюць аўтарытэтам, дастатковым, каб уважаць іх за выразнікаў поглядаў нацыі.

Дар'я Раткевіч, студэнтка Эканамічнага ўнівэрсытэту:

— Гэта найперш дзейсныя людзі, якія ўвасабляюць найбольш уласьцівыя рысы свае нацыі. Беларуская эліта мае будучыню, бо ў нашых умовах гэты панятак пашыраецца на ўсіх, хто змагаецца за Беларусь.

Апытваў Віктар Мухін

БЕРАЖЫЦЕ ЭЛІТУ

Думка прафэсара Клачоўскага пра захаваньне і пашырэньне эліты ня новая. Аднак не прыпомню, каб нехта ў нас ставіў гэтую задачу на першае месца. На першым месцы заўсёды былі заклікі ратаваць незалежнасьць і мову, а вось ратаваць нацыянальную эліту — носьбіта гэтых ідэалаў — не заклікалі.

Чарговая саюзная дамова чарговы ж раз павяргае беларускага інтэлігента ў панылы стан. Усё пачалося ў траўні 95-га, калі быў праведзены рэфэрэндум пра мову і сымболіку, і з тых часоў з рэгулярнай пэрыядычнасьцю паўтараюцца гэтыя крыўдныя ўдары і гэтае несуцешнае пачуцьцё ўласнае бездапаможнасьці. Хтосьці ўрэшце расчараваўся ў нацыянальных ідэалах, хтосьці нібы акамянеў сэрцам, а большасьць прыняла на веру зручную формулу: маўляў, усе гэтыя інтэграцыйныя захады нічога ня значаць, і галоўнаму інтэгратару таксама нічога, акрамя тэлевізійнай карцінкі, не даюць. Слабое суцяшэньне...

Беларускай інтэлігенцыі становіцца візуальна меней, яна ўсыхае нібы тая шчыгрынавая скура, яна расьцярушаная і не зьвязаная міжсобку, яна слабая. Яна ўсё ніжэй згінае галаву пад ударамі ўсё новых дамоваў, аб'яднаньняў і інтэграцыйнай траскатні, сапраўдны сэнс і рэальны плён якіх, здаецца, толькі ў тым і заключаецца, каб пакрыўдзіць, зьнішчыміць, зьнішчыць яе, беларускую нацыянальную эліту.

Я намаляваў наўмысна ўтыраваную карціну дзеля таго, каб ярчэй убачыць прычыны такога становішча і магчымыя выхады зь яго. Можна было б, наадварот, пералічыць масу ініцыятываў і ўчынкаў, калі беларускі інтэлігент, нягледзячы ні на што, працягвае рабіць сваю справу — выдае пэрыёдыкі і кніжкі, адчыняе мастацкія выставы, піша пранікнёныя вершы... Але ўся гэтая дзейнасьць разам узятая носіць экстэнсіўны характар. Подзьвігі ўчыняюцца па завядзёнцы і таму, што ўчыняць іх патрабуе сьветапогляд. Аднак пануе ва ўсім гэтым інэрцыя. Колішняя дылема пра дзьве неабходныя часткі адраджэньня — руціну і фэерыю — перастае быць дылемай, а застаецца толькі руцінай зь няяснай надзеяй на тое, што некалі ўсё нейкім чынам перамяніцца на лепшае.

Думка прафэсара Ежы Клачоўскага пра захаваньне і пашырэньне эліты, здаецца, ня новая. Аднак жа не прыпомню, каб нехта ў нас ставіў гэтую задачу на першае месца. На першым месцы заўсёды былі заклікі ратаваць незалежнасьць і мову, а вось ратаваць нацыянальную эліту — носьбіта вышэй пералічаных ідэалаў — не заклікалі. У выніку многія з нацыянальнае інтэлігенцыі страцілі веру ў сваю патрэбнасьць грамадзтву.

Сымптаматычна, што разуменьне нацыянальнае эліты як асновы прыходзіць да тых, хто займаецца беларускай сытуацыяй звонку, на Захадзе. Мне даводзілася сустракацца з прадстаўнікамі розных заходніх фондаў, якія спансаруюць, у прыватнасьці, незалежную прэсу. У папярэднія гады яны казалі, што нацыянальная культура не ўваходзіць у кола іхных зацікаўленьняў, бо нічога ня можа зьмяніць у рэчаіснасьці. Цяпер усё зьмянілася. Выходзіць, няслушна расстаўляліся акцэнты. Па-мойму, адказваю я ім, уся справа ня ў тым, супраць каго змагацца і каб скінуць Лукашэнку, а ў тым, за што змагацца, у тым, каб сфармуляваць характарыстыкі тае Беларусі, якую мы хочам, каб выснаваць тыя якасьці ў людзях, якія мы лічым патрэбнымі захаваць і разьвіць.

Нацыянальная інтэлігенцыя пакуль яшчэ працягвае страчваць, а не набываць. Я маю на ўвазе такую важную рэч як салідарнасьць. Мне згадваецца паказальны прыклад — апытаньне, якое «Наша Ніва» правяла пасьля Чарнобыльскага Шляху 1996 году, калі 200 чалавек апынуліся за кратамі. Што такое салідарнасьць інтэлігенцыі? — запыталіся мы тады ў розных дзеячоў. Паэт Уладзімер Някляеў адказаў:

«Я лічу разьдзіраньне чарнобыльскай трагедыі ў палітычных мэтах абсалютна амаральнай дзеяй як з аднаго боку, так і з другога. Я разумею народнафронтаўцаў, асабліва іх лідэраў, якім перакрыта тэлебачаньне, радыё, прэса. Яны палітыкі ў пераважнай большасьці. Але яны ведалі, на што ішлі. Ім трэба палітычна не памерці, абазначацца, каб быць нейкай, хоць бы ўяўнай, палітычнай сілай. Яны сталыя мужчыны і ведалі, на што ішлі. Вось вы пытаецеся пра салідарнасьць, а яны ведалі, на што ішлі. І, магчыма, баючыся гэтага ўнутры, яны гэтага й хацелі».



Фота Анатоля Клешчука

Яны ведалі, на што ішлі... Лёс самога Ўладзімера Някляева паказаў, што адсутнасьць салідарнасьці — гэта няслушны шлях, які прыводзіць толькі да агульных грамадзкіх і культурных стратаў. Як у тым хрэстаматыйным прыкладзе з фашыстоўскае Нямеччыны. Прыйшлі па суседа. Дык ён жа жыд, — падумаў я. Прыйшлі па другога суседа. Дык ён жа камуніст, — падумаў я. Прыйшлі ўрэшце і па мяне... Нагадаю, што менавіта пагроза арышту змусіла Ўладзімера Някляева перабрацца ў Польшчу, дзе, як мне здаецца, беларускі паэт пачуваецца адарваным ад радзімы.

Берагчы эліту — гэта ня толькі даваць камусьці грошы або выхоўваць дзетак у адпаведным духу, хоць гэта і вельмі істотна. Праявы апекі могуць выяўляцца ў тысячы буйных і дробных учынкаў. Выпішыце беларускую газэту, слухайце незалежнае радыё, купіце кнігу беларускага паэта — і гэта будзе калясальная ў нацыянальным маштабе падтрымка асобных творцаў і цэлых групаў нацыянальнае эліты. Згадваю, што апошняе выданьне эстонскай энцыкляпэдыі за савецкім часам разышлося накладам 250 тысяч. Гэта значыць, купіла кожная сям'я. У тым ліку сям'я рыбака на далёкім хутары, дзе бацька цягае нерат, а маці цыруе шкарпэтку. Вялікія калектывы беларускіх гуманітараў не пачуваюцца запатрабаванымі грамадзтвам, а ва ўмовах рынку — яшчэ й не забясьпечанымі ім. Аднак, тут няма папроку грамадзтву, у чым не было б ніякага сэнсу. І мае развагі датычаць толькі самой беларускай эліты. Бо, як пісаў Уладзімер Караткевіч, ня трэба двух, каб пачаць.

Зразумелая прычына несалідарнасьці беларускіх інтэлігентаў. Беларуская савецкая эліта заўсёды была на ўтрыманьні дзяржавы і ніколі не рабіла стаўкі на ўласныя сілы. Напрыклад, не сакрэт, што міт пра нізкую раскупляльнасьць беларускай кніжкі падтрымліваўся самімі выдаўцамі, бо гэта давала ім магчымасьць разьлічваць на большыя дзяржаўныя датацыі. Для рынкавых умоваў такі падыход азначае сьмерць кнігі.

Аднак інэрцыя захоўваецца. Толькі апэляцыі да дзяржавы, а калі яны не даюць плёну — дык саркастычная, зьнішчальная крытыка таго ж Лукашэнкі, і больш нічога. Няправільная моўная палітыка і гэтак далей. Усё гэта так. Толькі не адтуль трэба пачынаць. Справа падтрымкі і пашырэньня нацыянальнае эліты пачынаецца не з заканадаўчай дзейнасьці. Яна знаходзіць адлюстраваньне ў законах толькі пасьля таго, як становіцца фактам рэчаіснасьці. Спрошчана кажучы, калі я непатрэбны сам сабе, як я магу патрабаваць закона аб патрэбнасьці мяне іншым?

Сяргей Паўлоўскі

ЧАШНІКІ, РАДЗІМА ОСКАРА МІЛАША, ГАЛЕЧА І ЗАПУСЬЦЕНЬНЕ

Цяпер мала хто ў нас можа ўявіць сабе, што Чашніцкі раён мае багатую гісторыю. А менавіта тут знаходзіцца старажытны Лукомаль, цэнтар некалі слыннага й заможнага княства. Побач ёсьць яшчэ вёска Чарэя. Некалі й тут быў княскі пасад. Чарэя славілася сваім базыльянскім кляштарам, што стаяў на высьпе пасярод возера. А яшчэ гэтая мясьціна дала сьвету выбітнага французскамоўнага паэта-містыка Оскара Любіча-Мілаша. Пасьля першай сусьветнай вайны ён стаў літоўскім дыпляматам у Парыжы і ўсе свае сілы аддаў услаўленьню Літвы, хоць да канца дзён гэтак і не акрэсьліў, нават сам для сябе, дзе яе межы... І ўвесь час мроіў пра сваю мітычную Чарэю. Вось як ён апісваў родны край ў адной са сваіх лекцыяў:

«Хадземце, я павяду вас у думках у край дзівосаў, сутоньня, імглы й ціхіх шэптаў... Вось мы і тут, на ўскраінах польскіх земляў, ужо паўночных, але яшчэ закаханых у колеры. Адзін мах крыла — і мы праляцім над краінай, дзе ўсе рэчы пазначаныя прыгаслым колерам успамінаў. Нас агортвае пах гарлачыкаў, імжыстая лясная смуга...»



Фота Ўладзімера Цімашэнкі

У часы маладосьці Мілаша Чарэя лічылася культурным мястэчкам. Тут былі народная вучэльня, касьцёл, сынагога ды царква. У блізкіх Чашніках у тыя самыя часы працавалі ажно тры народныя вучэльні й адна вышэйшая, было шмат розных бажніцаў. І нават у легендарным Лукомлі на 140 хатаў была школа, прыхадзкая вучэльня, ізноў жа царква, касьцёл ды сынагога.

З тых часоў шмат чаго зьмянілася. Чашніцкі раён цяпер — амаль цалкам мэліяраваная раўніна, адзіная слава якое — электрастанцыя імя 50-х угодкаў СССР у Новалукомлі й Лукомскае вадасховішча пры ёй, на дне якога засталіся курганы й магілы...

Нядаўна пра родны край Оскара Мілаша згадалі і ў Менску. Пасьля крытычнага артыкула ў «Советской Белоруссии» ў Чашніцкі раён з інспэкцыяй зьезьдзіў Лукашэнкаў памочнік Посахаў. Па выніках ён паклаў на стол свайго начальніка *дакладную запіску*, у якой красамоўна апавёў пра гэты куток Беларусі. Улічваючы, што гэтая запіска ў газэту ня трапіла, прывяду зь яе пару цытатаў.

«...Лад жыцьця нават вясковае інтэлігэнцыі (настаўнікаў, спэцыялістаў саўгасаў і гэтак далей), ня кажучы пра простых работнікаў, дэградуе. Людзі сьпяць без пасьцельнае бялізны, ня маюць нармальнага посуду, апранутыя ў лахманы, практычна не карыстаюцца звычайнымі сродкамі гігіены, мыйнымі сродкамі, ня маюць тэлевізараў, не чытаюць газэт. У дамах зусім няма кніг і часопісаў. У большасьці дробных паселішчаў няма тэлефоннае сувязі. У некаторых дамах адлучанае энэргазабесьпячэньне. Выбітыя шыбы зробленыя дыхтай».

Гэткім выглядае Чашніцкі раён пры канцы XX ст. Вядома, адсутнасьць кніг на радзіме Мілаша рэч дзікаватая. Але й гэта ня ўсё... Далей Посахаў піша:

«Харчаваньне людзей крайне беднае — сала ды бульба, бо ляда ўняў няма, лёхі не выкарыстоўваюць, садавіну й гародніну няма дзе захоўваць. Ды й немагчыма іх набыць. Дзеці вымерханыя, выглядаюць млявымі, неахайна апранутыя. Іх ратуе ад голаду толькі цэнтралізаванае харчаваньне ў школах. Мэдычная абслуга кепская. У клюбах ня топіцца».

Фота Анатоля Клешчука



На чатырох старонках гэтага дакумэнту паўстае катастрафічная карціна жыцьця беларускай правінцыі. На загад чыноўніка зь Менску ў тым раёне была праведзеная генэральная прыборка. Што маглі — тое зрабілі... Купляць жа кнігі тутэйшым людзям, вядома, ніхто ня будзе. Зрэшты, і карміць іх няма каму. А сакрэтныя *дакладныя запіскі* апошніх гадоў лягуць у архівы. Можна шукаць вінаватых, але сёньня няма сэнсу.

Ёсьць сэнс пачытаць Оскара Мілаша. Ягоная радзіма застанецца ў сусьветнай культуры гэткай, якой яе стварыў ён. Бяз голаду, бруду і брыды запусьценьня...

Сяргей Харэўскі

Тона Стан. «Чаканьне ласкі»

Іван Пінкава. «Абэль і Каін»

ФОТАМАСТАЦТВА: У ВІЛЬНІ І Ў МЕНСКУ

У галерэі *Arka* ў Вільні прайшла фотавыстава «Чэская фатаграфія 90-х». Былі прадстаўленыя творы Яна Саўдэка, Тона Стана, Івана Пінкавы, Міхала Мацку, Міра Шволіка. Вокладку выдатнага альбому, надрукаванага да выставы, упрыгожвае здымак Тона Стана з вокам жанчыны, што пазірае на гледача праз скрыжаваныя калені ўласных ног. Здымак, які па сваёй моцы можна параўнаць хіба што зь вядомымі «Сьлёзамі» Мана Рэя. У ня менш выразных творах Івана Пінкавы позіркі працінаюць гледача наскрозь, а вонкавая аголенасьць цела й галоваў настолькі ўзмацняе псыхалягічнасьць, што складаецца ўражаньне нейкага незямнога паходжаньня вобразаў. Міра Шволік уражвае фотакалажамі, на якіх вытанчана сплятае краявіды з чалавечай парай ці рыбінай, чым пераконвае ў тоеснасьці ўсяго жывога на зямлі.

Роздум і пытаньні выклікае наведаньне нядаўняй аналягічнай выставы «Нямецкая фатаграфія 1980-х гадоў», якая экспануецца цяпер у Менску ў залі Беларускай Акадэміі Мастацтваў, дзе чарговы раз пераконваесься, што наш горад немцы, мабыць, лічаць глыбокай правінцыяй, раз нават такая паважаная арганізацыя як Інстытут Гётэ прывозіць другасныя экспазыцыі амаль аматарскай ці клюбнай фатаграфіі, на якія ня варта было б марнаваць нямецкія грошы і ўвагу беларускага гледача. І другое, што датычыць уласна нас — чаму айчынныя фатографы ня здольныя зрабіць нейкую хоць блізкую супольную экспазыцыю, чаго не стае? Арганізатара, тэхнічных магчымасьцяў ці запатрабаванасьці ў нашай краіне мастацкага фота наагул? Відавочна, што агульная карціна сучаснай беларускай фатаграфіі невядомая нікому (колькі гадоў таму Надзея Карotкіна была распачала працу над такім альбомам, але з закрыцьцём Фонду Сораса, які меўся фінансаваць праект, усё спынілася).

Дзяніс Раманюк

НОЧ РЭКЛЯМЫ: У МЕНСКУ І Ў ВІЛЬНІ

На мінулым тыдні ў віленскім кінатэатры Lietuva адбылася «Ноч рэклямы». Ад аналягічнай падзеі трохтыднёвай даўніны ў менскай «Маскве» яе адрозьнівала значна лепшая якасьць паказу.

Калі ў Менску гледача, які заплаціў тыя ж 10 даляраў, што й віленчук, цягам амаль дзьвюх гадзін напачатку бавілі лязэрным шоў, КВНам і абдорваньнем зь невядомай нагоды падарункамі пераможцы лятарэі (як абурыўся адзін з гледачоў: «Я што, прыйшоў паглядзець, як за мае грошы абдораць нейкую дурніцу?»), дык у Вільні без усялякіх паказвалі тое, па што прыйшлі гледачы. Дэманстраваліся тыя ж 500 рэклямных кліпаў з калекцыі Жан-Мары Бурсыко, шмат зь якіх, відавочна, не зьяўляюцца лепшымі, як сьцьвярджаюць арганізатары абедзьвюх імпрэзаў. У гэтай калекцыі адсутнічаюць некаторыя сапраўды слаўныя ролікі. І ў Менску, і ў Вільні першая частка праходзіла весела, бо публіка актыўна рэагавала на экраннае відовішча, была пад завязку забітая заля. На другой палове весялосьці стала значна меней, а тыя, хто працягваў назіраньне, якое ператварылася ў бясконцы мульцік, пачалі носам вадзіць. Відавочна, што відовішча не каштуе заплочаных грошай, бо й па целіку можна да расьпяртухі наглядзецца такога ж «на халяву».

Дзяніс Раманюк

DIE MODERNEN SAGEN-6

Сяргей БАЛАХОНАЎ

Мянялы

Быў час, калі дзяржава надта пільна змагалася з самагонаварэньнем. Як толькі ні вылузвалася міліцыя, абы спаймаць каго на гэтай справе. У адной вёсцы было так. Колькі міліцэйскіх, апранутых па-чалавечы, хадзілі па хатах ды нібы прадавалі накрыўкі. Прыйшлі да аднае бабкі, маўляў, ё такі тавар дэфіцытны, прадаем, але не за грошы, а за самагон. Бабка без хістаньняў палезла ў склеп па слоік самаробнай гарэлкі. А мянты ёй дакумэнты ў морду і цап-царап. Ды больш ім не пашэнціла — прайшлася неяк пагалоска. І калі на чыйсьці парог ступалі чужаніцы з прапановамі якога-кольвек абмену, дык іх пераймалі мужыкі з качэргамі ці сякерамі ды пасылалі нязваных гасьцёў блізка ў адзіным напрамку.

Пачута ў перапоўненым транспарце. Яшчэ «Ўставай на валокі» (1557 г.) сялянам забаранялася вырабляць гарэлку. Адвечная барацьба дзяржавы за манаполію ў гэтай справе часьцяком знаходзіць камічны адказ у гушчах народу.

Пальцы

Дзядзька мне расказаў пра свайго новага знаёмца. Не пасьпелі яны шчэ як сьлед разгаварыцца, як той прапанаваў адгадаць, колькі пальцаў на ягонай левай руцэ, паставіўшы на кон нейкую суму грошай. Дзядзька згадзіўся і стаў думаць, мяркуючы, што ў спрачальніка ці ўсе пальцы на месцы, ці некалькіх не стае. Трохі пахістаўшыся, ён адказаў:

— Пяць.

— Няпраўда, — запярэчыў знаёмец і паказаў левую далонь, дзе між вялікім і ўказальным красаваў яшчэ адзін маленькі пальчык.

Запісана з расповеду старшакляcьніцы белабалоцкай школы. Людзі з даўніх часоў адчуваюць інтарэс да размаітых выродстваў і паталёгіяў цела (гл. напр. «Магілёўскую кроніку»). Наш час не ўяўляе тутака вынятку.

Пяшчота

Адна дзяўчына распавядала. Неяк яна драмала, лежачы на ложку ў сваім інтэрнацкім пакоі. Да напарніцы ейнай прыйшла сяброўка, і яны абедзьве нешта доўга балбаталі. Калі тая сабралася выходзіць, дык няўцям прыпынілася каля дрымотніцы, нахілілася і пацалавала ў вусны. Дзяўчына прачнулася і задумена заплюскала вачыма. «Нечаканы наплыў пяшчоты», — прамовіла цалавальніца і, крыху зьбянтэжана, пакінула пакой.

Чута зьбіральнікам ад самае «ахвяры» пяшчотнасьці. Гісторыя пацьвярджае існуючы мужчынскі стэрэатып аб падсьвядомым лесьбійстве ўсіх жанчын.

Злыдні з хуткай дапамогі

Недзе пад Менскам дзеці без дазволу выхавальнікаў пайшлі за тэрыторыю лягеру адпачынку. Па дарозе ім сустрэлася машына хуткай дапамогі. Стуль павылазілі дзядзькі ды нарабілі дзецям уколаў, ад якіх тыя памерлі — кішкі палопаліся.

Занатавана са словаў стрыечніка-зьбіральніка. Сага ёсьць неверагоднай інтэрпрэтацыяй нядаўніх рэальных выпадкаў з маньякам, што калоў дзяўчынкам нейкую вадкасьць. Страх і цікавасьць малююць сьмерць. ■

каляндар

200 ГАДОЎ ТАМУ

1799. Пяць гадоў як задушылі паўстаньне Касьцюшкі. Але расейцы яшчэ не пачуваюцца ў нашым краі гаспадарамі. У Эўропе неспакойна. Усіх пужае Напалеон. Неўзабаве ён абвесьціць сябе імпэратарам. Ягоная параза ў паўночнаафрыканскай выправе нікога ня ўводзіць у зман — «хлопчык трэніруецца». У складзе напалеонаўскага корпусу Дамброўскага ваюе беларуская, дакладней, літоўская шляхта.

Тым часам расейцы падзяляюць «новадалучаныя» тэрыторыі на Беларускае й Літоўскае генэрал-губэрнатарствы. Намесьнікам апошняга прызначылі Міхаіла Кутузава, таго самага, «які бяз вока». На гэтай пасадзе ён праслужыць тры гады, а ў 1801-м губэрнатарства падзеляць на Віленскую і Гарадзенскую губэрні. Гэты час пазначаны расейскім імпэрскім лёзунгам «мы наш, мы новы мір пастроім». Напрыклад, ужо два гады як актыўна будуецца Бярэзінская водная сыстэма. Але галоўныя праекты зьвязаныя з гарадамі.

У 1799 складаецца плян перабудовы Менску. На тагачасным ускрайку места закладаюць парк, які сёньня палохае прыежджых дзіўнаватаю назваю «Горкага»...

У Вільні па-польску выдадзены «Полацкі палітычны каляндар», Станіслаў Юндзіл публікуе «Прыкладную Батаністыку».

У вёсцы Калюжыцы на Меншчыне нараджаецца жывапісец Валенты Ваньковіч, а наваградцу Адасю Міцкевічу, партрэт якога ён намалюе праз 29 гадоў, ужо цэлы годзік!

Два гады як зачынілі Магілёўскую друкарню, заснаваную арцыбіскупам, пісьменнікам і славістам, дзядзькам В.Дуніна-Марцінкевіча, С.Богушам-Сестранцэвічам.

Праз трынаццаць гадоў беларусы сустрэнуцца на Барадзінскім полі ў розных войсках, каб праз пару месяцаў працягнуць распачатую за Касьцюшкам традыцыю масавага сыходу на Захад. Але вера ў тое, што навалу з Усходу можна спыніць, будзе перадавацца з пакаленьня ў пакаленьня аж да нашых дзён.

Севярын Квяткоўскі

слоўнік паняцьцяў

14. ПРА ЭТЫКУ АХВЯРЫ.

Беларуская інтэлігенцыя цягам апошняга дзесяцігодзьдзя хапатліва шукае таго супольнага пачатку, таго асявога стрыжня, «які б здолеў аб'яднаць нацыю». Рэч ясная, адразу нешта знаходзіцца, асабліва, калі здаваляцца тым, што як бы ляжыць на паверхні і як бы даступна няўзброенаму воку. У такіх фармулёўках беларусы — «памяркоўныя», «скрытнаэўрапейскія» ці нават проста «зычлівыя» і «талерантныя» носьбіты «традыцыйнай духоўнасьці». Наш адказ будзе іншым — беларусаў лучыць тое, што яны вызнаюць этыку ахвяры.

Этыка ахвяры, як адна з найважнейшых праяваў каляніяльнай заняволенасьці, так глыбака пранікла ў плоць і кроў беларусаў, што фактычна дагэтуль і не станавілася аб'ектам сур'ёзнай ці, прынамсі, самастойнай рэфлексіі. Дык у чым жа палягае яна, гэтая этыка, як і чаму яна паўстала, і ці варта чакаць яе хуткага і незваротнага зьнікненьня?

Няпраўда, што русіфікацыя ці нейкая іншая калянізацыя — гэта толькі моўная асыміляцыя. Раней ці пазьней настае «самае галоўнае» — *асыміляцыя сьвядомасьці*. Гэтая дзея найчасьцей расьцягваецца на ўзглядна вялікія прамежкі часу, і таму яна не настолькі выразная, як моўная асыміляцыя. Але гэтага нельга сказаць пра наступствы гэтага зьнішчальнага працэсу. Яны бываюць самымі неспадзяванымі — ад нядоўгага траўматычнага шоку і да працяглай гістарычнай амнэзіі. Ахвярамі стаецца чалавек, грамада, народ.

Якраз адсюль, з траўмаванай сьвядомасьці, і вырастае этыка ахвяры. Праявы яе мы бачым паўсюдна — у самаадпрэчваньні ўласнага «Я», у сутаргавых прыслужніцкіх жэстах і рэпліках, у гатовасьці скарыцца, прыняць нават найвялікшае зло. І вось нарэшце зьяўляецца афэкт вечнай укрыўджанасьці, які ўвасабляецца ў бездаможным калектыўным енку «Ратуйце!».

Адныя беларусы «ратуюцца» ў Маскве, другія — у Варшаве, але і там, і гэнам чуваць бясконцыя крыкі-кленічы аб дапамозе і падтрымцы. Так этыка ахвяры перашкаджае нам стаць гаспадарамі ў сваім уласным доме.

Істотным складнікам гэтай этыкі ёсьць і каляніяльны комплекс віны, які пачаткова разьвіваецца як рэакцыя тубыльцаў на арганічную няздольнасьць цалкавіта прыпадобніцца да сваіх «цывілізатараў» і выражаецца ў іхным несупынным самапрыніжэньні. Экспэрымэнт па ўтрыманьні эканомікі зьніклай дзяржавы, які вось ужо колькі гадоў праводзіцца ў жыцьцё вялікімі беларускімі начальнікамі, відаць, таксама матываваны гэтым нязносным пачуцьцём віны, якое цяжэразным цяжарам кладзецца на іх плечы. Віны за тое, што так да канца і не прыпадобіліся, не адсяклі частку саміх сябе і ня выкінулі прэч, далоў, карацей, што далі разваліць. У іх недзе ўсярэдзіне дагэтуль жыве ды сьвербам сьвярбіць думка, салодкая думка — а можа, Масква такі выдзеліць фонды, і ўсё наладзіцца, бо мы такія бедненькія.

Вялікія беларускія начальнікі перажываюць заўважную раз-пораз адсутнасьць [мужчынскай] увагі з боку Масквы як глыбокую асабістую трагедыю.

Часы зьмяніліся, — жарлівыя гаротнікі і нядбалыя галетнікі ў цывілізаванага сьвету выклікаюць больш не сымпатыю, а нейкае зьмяшанае пачуцьцё брыды і агіды.

Валерка Булгакаў

50-60-JA: VYZVALEŃNIE I ADRADŽEŃNIE

19 listapada ū Londanie adbyłasia prezentacyja novaj knihi anhielskaha słavista praf. Londanskaha ūniversytetu Arnolda McMillina "Belarusian Literature in the 1950s and 1960s: Release and Renewal") (Biełaruskaja litaratura ū 1950-1960-ja hady: Vyzvaleńnie i adradžeńnie"), jakaja miesiac tamu vyjšła ū niamiecka-aūstryjskim vydaviectvie Bohlau Verlag. Praf.McMillin u svajoj pracy źviarnuūsia da hadoū "vyjścia ź ciemry" biełaruskaj litaratury paśla śmierci Stalina i jejnaha raźvićcia pad čas adnosnaje volnaści ū 60-ja hady.

Pieršaja navukovaja praca praf. McMillina – "Słoūnik biełaruskaj litaraturnaj movy XIX stahodździa" – vyjšła ū 1973 h.

Pavodle a.Alaksandra Nadsona, jaki ūziaū słova pad čas prezentacyji, "Historyja biełaruskaj litaratury" A.McMillina (1977) — pieršaja surjoznaja praca padobnaha kštałtu pavodle pryncypaū i standartaū zachodniaha litaraturaznaūstva. Apošni artykuł praf. McMillina, pryśviečany paeziji Ū.Karatkieviča, apublikavany sioleta ū biełastockim časopisie "Termapičy". U 1992 h. jon padrychtavaū zbornik Łarysy Hienijuš "Vieršy", rukapis jakoha ū svoj čas pieradaū u Londanskuju Skarynaūskuju biblijateku adzin ź biełarusaū, što apynuūsia ū Niamieččynie.

Sp.McMillin miarkuje zakončyć praz 2 hady knihu, jakaja budzie pryśviečanaja našaj litaratury ū 70-80-ja hady.

Aleś Nieščarda, Londan

ІНВЭНТАР ВЫВЕЗЕНАГА Ў РАСЕЮ

Дакумэнты да гісторыі царквы ў Беларусі XVI—XIX ст. у фондзе «Канцылярыя мітрапаліта грэка-ўніяцкіх цэркваў у Расеі»: Даведнік. Уклад. С.Паўловіч, Т.Мальцава. — Менск-Полацак: Сафія, 1999. —386 с. ISBN 985-6448-05-0

Калі мне трапіла ў рукі гэтая кніга, я падумаў — вось, працяг антыўніяцкай кампаніі. Заблытала назва выдавецтва: ведаю, што менская фірма «Лучи Софии» выдае кнігі супраць уніятаў, а проста «Сафія» — гэта, аказваецца, уніяцкае выдавецтва. Мэты яно ставіць навуковыя: «Беларуская Грэка-Каталіцкая Царква шчыра зацікаўленая ў грунтоўным і аб'ектыўным дасьледаваньні ўласнае гісторыі» — і сацыяльныя: «Толькі на грунце аб'ектыўных гістарычных дасьледаваньняў будзе магчымым партнэрскі і братэрскі міжканфэсійны дыялёг у Беларусі».

Як ведама, старадаўні ўніяцкі архіў цяпер знаходзіцца далёка ад Беларусі, у Санкт-Пецярбургу. У такіх абставінах весьці навуковыя дасьледаваньні уніі нам вельмі цяжка. Выдадзеная кніга значна палегчыць працу нашых дасьледнікаў, бо ў ёй — інвэнтар дакумэнтаў з таго архіву. Праўда, інвэнтар арыгінальны: не старадаўні і не сучасны навуковы, а канцылярска-архіўны канца XIX — пачатку XX ст., на расейскай мове. Такім ён і надрукаваны. Заўважым, што ў 1897 і 1907 гадах выйшлі 2 тамы «Описания документов архива западнорусских униатских митрополитов», то бок гэтага самага архіву. Быў падрыхтаваны да друку і 3-ці том, але рэвалюцыя заступіла яму дарогу.

Дык што за «Архіў» выйшаў у 1999 годзе? Ці гэта той інвэнтар, што маецца цяпер у Санкт-Пецярбурскім архіве, ці той, што быў надрукаваны ў 1897—1907 гадах? Адказу няма, бо ўкладальнікі кнігі не палічылі патрэбным адзначыць гэта. А дарма, гэта быў адзін зь іх галоўных абавязкаў. Здаецца, гэта інвэнтар з архіву, бо раней друкаваны быў трохі інакшым. Прыкладам, першы



дакумэнт зь цяперашняга выданьня мае тытул «Дарственная запись княгини слуцкой Анны Слуцкому Троицкому монастырю на Локнейский став. 17.09.1489», а ў выданьні 1897 году значыцца ліст «на мельніка Семенца». Або другі прыклад. У выданьні 1907 году чытаем: «Дело по обвинению администратора селисской церкви Адама Назюкевича в причинении беременности прихожанкам. 15.04.1797», а ў цяперашнім выданьні — тое ж, але «Селецкой церкви». Толькі якому варыянту верыць?

І зусім новы сьпіс дакумэнтаў ёсьць у цяперашнім выданьні — інвэнтар тых архіўных справаў, што меркавалі надрукаваць да рэвалюцыі, ды так і не надрукавалі. Яго час прыйшоў сёньня. На жаль, складальнікі «Архіву» не далі арыгінальных назваў некаторых справаў з суцэльнага іх пераліку. А, можа, правільна зрабілі, што не далі, бо тыя, здаецца, украінскія. А каб не здавалася, дык трэба было проста напісаць, што тыя — сапраўды ўкраінскія.

А ўвогуле «Архіў» 1999 году — сапраўдны падарунак для беларускіх навукоўцаў, якія займаюцца рэлігійнымі справамі XVI—XIX ст. Цяпер бяз гэтай кнігі не абыдзецца ніякае дасьледаваньне гісторыі уніі і праваслаўя. Яно будзе падмуркам для наступных пошукаў. За далейшымі фактамі давядзецца, ведама, ехаць у Пецер, бо справа вяртаньня гэтага архіву цёмная і амаль невырашальная (былі слабыя спробы вярнуць ў 1920-х гадах).

Але і ў нашай старонцы ёсьць архіўныя матар'ялы пра унію. Іх, ясна, мала. Складальнікі гэта адзначаюць: «Дасьледнікам хрысьціянства часоў Сярэднявечча і сучаснасьці вядома, што ў гістарычных архівах Менску і Горадні захавалася невялікая частка дакумэнтаў пра ўніяцкую царкву. Астатнія альбо страчаныя, альбо месьцяцца ў замежных архівах». Але ж... Неяк, гартаючы зь нейкай прычыны актавую кнігу земскага суда Наваградзкага ваяводства за 1767—1768 гады (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Менску, фонд 1774, інвэнтар 1, справа 3), натрапіў на нечаканую і найкаштоўнейшую крыніцу — стары тагачасны інвэнтар архіву ўніяцкіх мітрапалітаў. Тады ён быў непараўнальна багацейшы, шмат якія дакумэнты паходзілі са старажытных часоў, мноства — з XVIII ст. І што за інвэнтар — у некалькі разоў больш падрабязны за цяперашнія. І якія там былі пэрліны, на жаль, зьніклыя назаўсёды, у тым ліку дакумэнты пра невядомых дагэтуль мастакоў. Прыкладам, такі запіс: «Дакумэнты кантракту з маляром Вайнікоўскім на маляваньне ў Наваградзкай катэдры. Штук 2. 1690, чэрвеня 17. Кантрактны ліст з маляром. 1691. Абліг ад маляра на 300 (złoty), выданы ксяндзу мітрапаліту».

Выдаўцы цяперашняга «Архіву» без усялякіх камэнтароў на вокладцы сваёй кнігі зьмясьцілі «А» — стараславянскі «нумар 1». Намёк, што выданьне дакумэнтальнай спадчыны ўніяцкай царквы будзе працягнута? Зьвяртаем увагу на інвэнтар зь менскага архіву — гэта на сёньняшні дзень самы варты для апублікаваньня дакумэнт. Да таго, мноства невядомых і каштоўных дакумэнтальных крыніц расьсеяна сярод самых розных фондаў Менскага архіву. Трэба іх шукаць.

Валеры Пазьнякоў

ЗАТ «Сотвар»

1. **Веткаўскі музэй народнай творчасьці** – 860 т.
2. Л.Васюковіч, М.Яленскі. **Мэтодыка выкладаньня беларускай мовы ў сярэдняй школе** – 285 т.
3. А.Вініцкі. **Матар'ялы да гісторыі беларускай эміграцыі ў Нямеччыне** – 45 т.
4. В.Адамчык. **Разьвітальная аповесьць** – 240 т.
5. В.Целеш. **Гарады Беларусі на старых паштоўках** – 1100 т.
6. **Дапаможнік для журналістаў Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы** – 44 т.
7. А.Дэні. **Гісторыя эканамічнай думкі** – 107 т.
8. З.Дудзюк. **Палоньнікі жыцьця** – 100 т.
9. **Беларускі народны соньнік** – 65 т.
10. А.Калубовіч. **На крыжовай дарозе.** Творы з эміграцыі – 260 т.
11. Бялоўскі. **Тэхнічныя сродкі навучаньня і мэтодыка іх прымяненьня** – 130 т.
12. В.Рагуля. **Успаміны** – 39 т.
13. У.Касько. **Сьвятло далёкай зоркі** – 325 т.
14. У.Неўдах. **Беларуская арганная культура ў кантэксьце эўрапейскага музычна-гістарычнага працэсу** – 1090 т.
15. Е.Мерачыцкі. **Сьветлым ценем Адама Міцкевіча** – 39 т.
16. **Літаратурная Гарадзеншчына** – 50 т.
17. **Новы запавет. Псалтыр** – 455 т.
18. А.Пушкін. **Выбраныя творы** – 935 т.
19. І.Саверчанка. **Кніжна-пісьмовая культура Беларусі** – 650 т.
20. Т.Процька. **Пакутнік за веру і Бацькаўшчыну** – 39 т.
21. У.Ліпскі. **Праўдзівы аповед пра твой і мой радавод** – 105 т.
22. **Шасьцімоўны слоўнік** – 195 т.
23. М.Чарняўскі. **Правадыр крылатых вершнікаў** – 195 т.
24. Янка Запруднік. **Беларусь на гістарычных скрыжаваньнях** – 325 т.
25. Янка Купала. **Поўны збор твораў. Т. 5: Вершы, пераклады 1930-1942** – 180 т.
26. Я.Найдзюк, І.Касяк. **Беларусь учора і сяньня.** Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі – 220 т.
27. М.Ермаловіч. **Старажытная Беларусь.** Віленскі пэрыяд – 200 т.
28. С.Станкевіч. **Русіфікацыя беларускай мовы ў БССР** – 100 т.
29. Я.Станкевіч. **Маленькі маскоўска-беларускі слоўнічак** – 100 т.
30. Юрка Віцьбіч. **Плыве з-пад сьвятое гары Нёман** – 100 т.
31. Бордович А., Гируцкий А., Чернышова Л. **Сопоставительный курс русского и белорусского языков** – 615 т.
32. Франц Кушаль. **Спробы стварэньня беларускага войска** – 715 т.
33. **Беларускі гістарычны агляд.** Том 5. Сшытак 2(9) – 650 т.
34. **Беларускі гістарычны агляд.** Том 5. Сшытак 1(8) – 650 т.
35. **Беларускі гістарычны агляд.** Том 4. Сшытак 1-2 (6-7) – 585 т.
36. **Беларускі гістарычны агляд.** Том 2. Сшытак 2 – 585 тыс.
37. **Беларускі гістарычны агляд.** Том 3. Сшытак 1 – 585 тыс.
38. П.Брунэль, К.Пішуа, А.-М.Русо. **Што такое параўнальнае літаратуразнаўства?** – 65 т.
39. **Фрагмэнты філязофіі, культуралёгіі, літаратуры.** (Зіма-97) – 390 т.
40. **Фрагмэнты філязофіі, культуралёгіі, літаратуры.** (Вясна-98) – 390 т.
41. І.Бабкоў. **Герой вайны за празрыстасьць** – 91 т.
42. В.Акудовіч. **Мяне няма** – 91 т.
43. Ю.Барысевіч. **Цела і тэкст** – 91 т.
44. **Кастусь Каліноўскі** ("Беларускі кнігазбор") – 806 т.
45. **Ян Баршчэўскі** ("Беларускі кнігазбор") – 806 т.
46. Часопіс **ARCHE,** нумары «Постмадэрнізм», «Вялікая айчынная вайна», «Кабеты», «Паталёгіі грамадзтва» – 690 т.

КНІГІ І ПАДРУЧНІКІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

1. Т.Атрошчанка, Г.Трафімава. **Таямніцы ў школьным ранцы** – 195 т.
2. Л.Дурэйка, Г.Лосева. **Чалавек і сьвет** (вуч. дап. для вучняў 1-га кл.) – 260 т.
3. А.Клышка. **Пісьмо** (для 1-га кл.) – 100 т.
4. А.Клышка. **Буквар** – 364 т.
5. **Матэматыка ў 4-х частках. Ч.1** (вучэбны дапаможнік для 1 кл.) – 130 т.
6. І.Бурсаў. **З вязкі па 3 казкі:** Казкі для дзяцей – 187 т.
7. М.Чарняўскі. **Хто пакрыўдзіў кракадзіла:** Вершы, казкі, прымаўлянкі, лічылкі і г.д. – 397 т.
8. Л.Пранчак. **Пра дзядулю, пра бабулю і пра іх унучку Юлю:** Вершы, песьні і казкі – 227 т.
9. **Заклятае возера.** Беларускія народныя казкі (з малюнкамі) – 334 т.
10. Мікола Гусоўскі. **Песьня пра зубра.** (Пераклад Я.Семяхона) – 370 т.

ВІДЭАКАСЭТЫ

"Болта", "Аліса ў краіне цудаў", "Прыгажуня ў сонным лесе", "Меч у камені" (мультфільмы) – усе 1200 т.

АЎДЫЁКАСЭТЫ

"Ехаў казачнік Бай", "Цік-так ходзікі", "Беларускія народныя казкі", "Стойкі алавянны жаўнерык", "Кадіф-бусел", "Азбука для маленькіх" – усе 450 т.

Кнігі з касэтамі можна атрымаць, пералічыўшы грошы звычайным паштовым пераказам на рахунак **ЗАТ "Сотвар" №3012000000195 у філіі 506 ААБ "Беларусбанк", код 809.** *220131, Менск, Шырокая 56.*

У графе "Для пісьмовага паведамленьня" напішыце, якую касэту або кніжку Вы замаўляеце.

Для допісаў: **220005, г. Мінск-5, а/с 13.**

Менчукі! Зьвяртайцеся па тэл.: **228-45-88**, *факс:* **228-45-87**. *У Віцебску —* **крама «Сучасьнік»** *(вул. Гогаля, 14).*

Каталёг можна атрымаць, патэлефанаваўшы ці напісаўшы.

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

У.Агіевіч. **Сымболіка гравюры Скарыны.** — Менск: Беларуская навука, 1999. — 320 с.: іл. — Наклад 1000 ас. ISBN 985-08-0303-7

Аўтар, які чамусьці ўпарта настойвае на называнні беларускага першадрукара Скарыной, а не Скарынам, спрабуе высьветліць зьмест і сымбалічнае значаньне ягоных гравюраў, дае сваю вэрсію таемных знакаў і сымбаляў ды іх этымалёгіі. Праца вызначаецца рэзкасьцю ацэнак, вэрсіяў і поглядаў іншых скарыназнаўцаў.

А.Ветах. **Кроніка смутку**: Раман, аповесьць-містыфікацыя, апавяданьні. — Менск: Мастацкая літаратура, 1999. — 207 с. — (Першая кніга празаіка). — Наклад 1000 ас. ISBN 985-02-0018-9

Р.Гардзей. **Межань**: Кніга лірыкі. — Менск: Беларускі кнігазбор, 1999. — 144 с. — Наклад 500 ас. ISBN 985-6318-48-3

А.Канапелька. **Летазьлічэньне**: Вершы. — Менск: Мастацкая літаратура, 1999. — 127 с. — Наклад 1300 ас. ISBN 985-02-0040-3

Я.Купала. **Поўны збор твораў: у 9 т. Т. 6**: Паэмы, пераклады. — Менск: Мастацкая літаратура, 1999. — 430 с. (4) арк. іл. — Наклад 5800 ас. ISBN 985-02-0422-2 (т.6)

Чарговы выпуск Купалавага збору ўлучае паэмы "На Куцьцю" й "На Дзяды". Цана 580 тысячаў.

У.Неўдах. **Cantantibus organis**: Беларуская арганная культура ў кантэксьце эўрапейскіх музычна-гістарычных працэсаў. — Менск: Тэхналёгія, 1999. — 170 с. — Наклад 200 ас. ISBN 985-6234-74-3

Адзіная на цяпер праца з гісторыі арганнае музыкі ў Беларусі. Упершыню складзены каталёг арганаў, а таксама зьмешчаная агульная храналягічная табліца й нотныя дадаткі.

І.Пракаповіч. **Шляхі наканаванага бязьмежжа**: Вершы/ Прадмова К.Камейшы. — Менск: Мастацкая літаратура, 1999. — 111 с. — (Першая кніга паэта). — Наклад 1000 ас. ISBN 985-02-0246-7

П.Саковіч. **Мілавіца**: Вершы. — Менск: Мастацкая літаратура, 1999. — 63 с. — Наклад 1500 ас. — ISBN 985-02-0272-6

Р.Смольскі. **На скрыжаваньні: Тэатар у працэсе станаўленьня й разьвіцьця нацыянальнае й гістарычнае сьведамасьці беларусаў**/ Нацыянальная Акадэмія Навук Беларусі. Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі й фальклёру імя К.Крапівы. — Менск: Беларуская навука, 1999. — 231 с.: іл. — Наклад 700 ас. ISBN 985-08-0575-1

Э.Сўінджвуд. **Сьціслая гісторыя сацыяльнае думкі**/ Пад рэдакцыяй У.Маруціка. — Менск: Тэхналёгія, 1999. — 349 с. — Наклад 1000 ас. ISBN 985-6234-68-5

Цьвёрдая вокладка і ўзорная беларуская мова гэтае кнігі (рэдактары Вінцук Вячорка і Алена Трусава), нягледзячы на цану (1 мільён рублёў), робяць яе добрым парадніком для навучэнцаў факультэтаў сацыялёгіі й проста цікаўных у беларускай спэцыяльнай навуковай тэрміналёгіі. Пры канцы зьмяшчаецца малы тлумачальны слоўнік сацыялягічных тэрмінаў.

У.Федасеенка. **Мутныя росы**: Раман. — Менск: Мастацкая літаратура, 1999. — 271 с. — Наклад 1500 ас. ISBN 985-02-0014-6

Кнігі чытаў Віктар Мухін

Малюнак Ірыны Чупрыненкі

Зьміцер Бабровец

Я НЯ ШАФА

Ты прыходзіш да мяне штовечар,
Мы «падганяем» нямецкую мову.
Ты — сарамлівая васьмікласьніца,
А я — ня шафа, я — твой настаўнік.

Адна на аднэй загарэлыя ножкі,
На прыпухлых вуснах — ні званьня
памады,
Вочы — сіняга неба глыбіні,
А валасы — першы сьнег... Вось ты якая.

А я — ня шафа, я — твой настаўнік,
Я цябе вучу нямецкае мове.
Праўда, словы Гётэ прабіваюцца слаба
Ад маіх вуснаў да тваіх вушак.

Ты паточыстым рухам трэш каленца,
Я з разьлёту зьбіваюся на мову Купалы,
Я ня ведаю, куды падзець свае вочы,
Мне страшэнна, да болю непамысна,

Бо я ня шафа, я — твой настаўнік.
Твае мяккія шчокі наліваюцца барвай,
Ты дыхаеш цяжка, а твае грудзі
Пад лёгкай апраткай пнуцца-вастрэюць...

І вось ён, момант, які ўславіў бы Гётэ!
Мы з табою ляцім у вырай...
Якая тут к чорту нямецкая мова,
Калі я ня шафа, а твой настаўнік!

Макс Багдан

ВЕРШНІКУ «ПАГОНІ»

Доўгі час ты ня быў на Радзіме.
Хтось парушыў гісторыі ход.
І ўжо не ганарыцца тваімі
Спадкаемцамі бедны народ.

Патрыётаў забылі імёны,
Адракліся ад назвы сваёй.
Пад узьдзеяньнем пятай калёны
Торг ідзе беларускай зямлёй.

Адняла твае сілы пагоня,
Мужны вершнік на белым кані,
Але ты не спыняйся сягоньня:
Ад манкуртаў свой край барані.

Ты галовы сячы рэнэгатам:
І вусатым, і лысым — усім,
Хто культуру расейскага мату
Распаўсюдзіў над краем тваім.

І пачвараў сячы дзьвюхгаловых,
Каб галоў не пладзілася больш.
Прагані псэўдародныя мовы
Старшабрацкіх расеяў і польш.

Аказаўся народ у палоне
Не далёка — на роднай зямлі,
І таму ўсё лятуць тыя коні,
Каб сьляды іх быццяў не сплылі.

Андрэй Барэйс

* * *

Павечаруй са мною сёньня,
У золак правядзі мяне,
Каханьня нашага бяздоньне
Аддай маркотнае вясьне,
Адгавары мяне ад цемры,
Суціш трывожнакрылы час,
Пачуцьцем сьветлым, чыстым, верным
Сузор'е запалі за нас,
Счаруй мяне сваёй усьмешкай,
Зьбяры у прыгаршчы расу
І ў вечнасьць акрапі нам сьцежку,
І ў лёхі адпусьці сьлязу,
Заваражы чульлівай песьняй,
Вачамі замілуй мяне,
Са мной памры і уваскрэсьні
Ў салодкім золкавым віне,
Згадай мяне ў сваім бяссоньні,
Знайдзі ва ўлоньні сьветлых лоз...
Павечаруй са мною сёньня
І начаруй нам шчасны лёс.

Ярына Берасьцейская

* * *

Пагуляй у валасах маіх,
Улюбёных у вільгаць зімовую.
Заняволіць нястрымны ўздых
Замяць вуснаў, халоднымі промнямі.
Так скрозь пальцы сыходзіць цяпло
Цыгарэтнаю, цьмянай пястотаю
І страсае цішком на далонь
Белы попел і толькі ўпотайкі
Нечакана губляеш слых —
Рух няспынны сусьветнай грацыі.
У валасах і на вуснах маіх
Заіржэлы смак радыяцыі.
Пагуляй у валасах маіх,
Улюбёных у вільгаць зімовую...

Зьміцер Захарэвіч

СЬВЯТА

Будзе сьвята колераў,
Будзе сьвята, як жа!
Будуць яшчэ мроі нам,
Будзе яшчэ страшна.

Мы яшчэ сустрэнемся:
Будзем піць за наша,
Плюнем на пякнейшае,
На канвой, на краты.

Хто пакіне шэрагі?
Можа вы, васпане,
Пойдзеце да «белых»
Хамаў з ланцугамі?

Мы сабе нацешымся —
Патанчым, засьпяваем.
Вы, мусіць, не пасьмееце,
А мы вас не чакаем.

Як, калі павернецца
Нашая цярплівасьць,
Вам тады паверыцца
Ў нашую сілу!

Мы засеем ворыва —
Нашыя палеткі.
Ад хлапцоў з малодкамі
Выйдуць нашы дзеткі.

Будзе жыцьцё файнае:
Мы пакінем цэрквы,
Мы пакінем фарныя —
Пойдзем да Вялеса.

І ва ўлоньні матухны,
Сам-насам з прыродай
Мы забудзем бразганьне
Вашай чорнай зброі.

Вам маўчаць, зайздросьціць нам
Трэба ў сваіх хатах.
Вы яшчэ папросіце...
Хутка ужо сьвята.

ЗА СЛАВАМІРА!

У нас была вясна,
І маразоў мільгалі сьпіны,
Калі Яна ўвайшла:
— Забралі Славаміра...

Яшчэ адной ахвярай больш.
Што зробіш? Але раптам зачапіла
Ды неяк сьціснула ў грудзёх —
Забралі Славаміра.

А час ішоў. І зернейка ўзышло,
І жаўрукі нябёсы захапілі.
Здаецца, добра ўсё, адно —
Забралі Славаміра.

Пайшлі дажджы — паскудная пара,
У стомленых дварох, вось, лісьце
запалілі...
Як запыталіся: «Каго няма?» —
Ледзь не сарвалася:
— Забралі Славаміра.

Чарговы келіх. Вы за што?
Зь мяне даволі вашых кпінаў —
Жадаю ўзяць суздром сваё,
А значыць, п'ем за Славаміра.

Нам ёсьць што бараніць,
Дальбог, ад Віцебску да Міра.
Хай дабраславіць вецер нам сьцягі —
За маці! За жыцьцё! За Славаміра!

KEIN RUSSLAND!

Прададзены горад даляравы рай
Мне малюе на шыбе вакна,
Такі непадобны й непатрэбны, я
Два словы сьціснуў у кулак —
K e i n R u s s l a n d!

Найлепшае шчасьце — быць ні пры чым,
Прачынаючыся кожную раніцу.
Рукі прэч! Сонца застанецца маім,
Як апошняе, што лашчыць гэтую зямлю.
K e i n R u s s l a n d!

Штыхет, карабін, россып гранат —
Зь мяне хопіць! Мама, бывайце!
Узрывай масты, разьлівай напалм
Пад ботамі калябарантаў!
K e i n R u s s l a n d!

Аляксандар Качанаў

* * *

Губляюць дрэвы лісьце за вакном,
Зайшла туга. І засталася побач.
Кранаю шкло. І зачыняю дом.
Мяне няма. А вусны паліць горыч.

Забытых дзён нясьмелае сьвятло.
Жахлівы сэнс зьнішчэньня і разлукі.
І дорыць край апошняе цяпло.
І зброі прагнуць маладыя рукі.

Уладзімер Кобец

АПОШНЯЕ КАХАНЬНЕ

Калі прарок нас пакідае ў муках,
А зброд дзічэе проста на вачах,
Як хочацца твае адчуць мне рукі
На стомлена-аголеных плячах.

Так хочацца бяздумна акунуцца
У вадаспад дзявочых валасоў,
Бо так балюча апаляе-сушыць
Мяне мая расплаўленая кроў.

Адчуць хачу шчакой тваё дыханьне
І непрытомным легчы у расу —
Ва ўлоньне неабсяжнага каханьня,
Ў зямлі прыфрантавую паласу.

Яўхім Корчак

* * *

У краіне казлоў,
дзе кіруе вышэйшы казёл,
мусіш мець бараду
і паказваць казьліныя рогі,
мусіш брудна ўскладаць
капыты на засьмечаны стол
і малітвы бляяць,
лоб б'ючы аб чужыя парогі.
Вось — казёл-кіраўнік,
вось — казьліны начальнік,
вось казьліны халоп,
а вось — проста казёл.
Галерэя казлоў...
Не, казьліны заказьнік,
дзе ўзрастаюць яны
і дзе гінуць
ад собскіх рагоў.

Ніна Мацяш

ДАРОГА

Баліць мая недасканаласьць
радні,
каму я патрэбна здаровая,
сябрам,
каму я патрэбна вясёлая,
каханаму,
каму я патрэбна раскутая.
Толькі дарога,
якою прайсьці мне патрэбна,
падлегла кожнаму руху яе,
успрымае мяне як уласны вытвар,
найадпаведнейшы
ейным вымогам.

Вадзянік Нямізкі

* * *

Ну вось, адбыўся Марш Свабоды.
«Разбор палётаў» на БТ:
Паскудны фільмік для народу,
Як у манашкі дэкальтэ.

Уся зімоўская майстэрня
Ажно выскоквае з парток.
Такая, братка мой, гамэрня.
Ды ўся магутнасьць — у сьвісток!

Папраціpайце акуляры.
Дагаварыліся — гамон!
Каб сапраўды далі даляры,
Дапамагаў бы нам амон.

За трыста тысячаў «зялёных», —
Кажу як ёсьць, «без дуракоў», —
Да Незалежнасьці калёну
Павёў бы Юры Сівакоў.

Вы, недарэкі, памаўчалі б!
Скурылі, пэўна, буквары,
Калі мы ў школе вывучалі,
Чаго баяліся цары.

А я зь дзяцінства добра помню,
Падручнік быў за пяты клас.
На вокладцы як быццам помнік:
Так ваяваў рабочы клас.

Скульптура Шадра, дзе зацята
Рабочы разьбірае брук,
І зброя пралетарыяту
Трапляе да магутных рук.

Няма ніякага сумненьня,
Таму і стаў каменным век,
Што з дапамогаю каменьня
Рабіўся з малпы чалавек.

Як не хапае сілы пальцаў,
Да камня цягнецца рука.
Ад малпаў і нэандэртальцаў
Аж да паўстаньня Спартака.

А прыклады Чырвонай Прэсьні
Ў мазгі загналі, як цьвікі,
Што не забудзеш, хоць ты трэсьні!
Пры гоп-рэжыме — не з рукі.

На добрых прыкладах вучылі:
Усе мы памятаем час,
Калі супроць рэжыму ў Чылі
Байкоты абвяшчалі ў нас.

І думка сьпее асьцярожна:
Не вінаваты камяні.
Калі супроць жыдоў — дык можна,
Сваіх жа дурняў не крані?!

Каб наша воля не зьвялася,
Далоў падвоены стандарт.
Час! Барацьба ўжо пачалася.
І гэта, браце мой, ня жарт!

З гарвыканкаму камуністы
Назло уладам, пакрысе
Апошнім часам, як наўмысна,
Забрукавалі плошчы ўсе.

І быццам чорную завесу
Зьдзіраем сёньня мы з павек.
У Беларусі век прагрэсу:
Хапае камень чалавек!

І ўлады нашы не ад Бога —
Расплата іх не абміне.
Ня трэба слухаць больш нікога,
Бо на вайне як на вайне!

Даваць адпор пара прымусу,
А не цярпець ганебны зьдзек.
Я зычу сілы беларусу!
Няхай жыве каменны век!

Валадар Цурпанаў

* * *

Мілая, пяшчотная Алеся,
Родная, каханая мая!
Як пачуцьці словамі данесьці,
Распавесьці, чым жыве душа?

Я хацеў бы стаць табе падлогай,
Каб ня зьбіла ты маленькіх ног.
Я хацеў бы стацца мяккай коўдрай,
Каб дабрацца холад ды ня мог.

Я хацеў бы стаць тваёю марай,
Што галоўнай будзе у жыцьці.
Але гэта ўсё адныя мары —
Разам шлях ня суджана прайсьці.

Viktar Šaciła

* * *

Ž.M.

Kali zharu — skažacie,
Jak ja jaje lubiŭ!..
U malitvach, u spakusie
Płamianieŭ i žyŭ.

Uzhadajecie vichuru
Na maju viasnu,
Jak duša rastavała,
Lubiačy adnu...

O, skažycie, parastki
Splažanaj ziamli,
Soncu, niebu, vodaru,
Tym, što zaćvili.

Мой Рым



Падарожныя зьдзіўленьні

Адам ГЛЁБУС

Рым — цяжкі горад. Ён цяжкі, як мармур, як задуха, як сьмерць. Рым належыць Рыму. Ён поўны сонца, пякельнай гарачыні і пракаветнай цывілізацыі. Ён пацяжэў утрая пад час зацьменьня Сонца. Адзінаццатага жніўня дзевяноста дзявятага году а дванаццатай пачалося зацьменьне. Людзі паспыняліся й праз чорныя шкельцы пачалі разглядаць неба. Ад Сонца застаўся акраец, падобны да ветаха. Зьмізарнела, зьнікчэмнілася ў нікчэмнасьці ўсё існае. Адно вечны горад павялічыў уласную значнасьць.

Пад час зацьменьня на пляцы Гішпаніі я спаткаў маладую японку з тварам, падобным да поўні ў тумане. Яна была адрошаная. Апакаліптычная зьява яе абыходзіла. Зрэшты, як і астатніх японцаў на плошчы. Пэўна таму, што культура Японіі — культура Месяца, культура ценю, культура адлюстраваньняў, а не сьвятла. Культуры Сонца: Грэцыя, Рым, Эўропа... Культуру беларусаў можна параўнаць хіба што зь ледзь заўважным серпікам Маладзіка. І гэты Маладзік досыць добра быў мне відаць з пляцу Гішпаніі, побач зь якім у кавярні "Грэка" геніяльны Гогаль напісаў, што толькі адсюль ён добра бачыць Расею.

Я ня ўбачыў Расеі з італійскага пляцу. Падманваць цябе няма сэнсу. Мае падарожныя накіды вымагаюць адно праўды. Калі зь іх зьнікне дакладнасьць, ты не даруеш, я ведаю. Таму, праўда й праўда пра рымскую ваду...

Рымляне п'юць ваду з-пад крану і проста з фантанаў. Яны ганарацца сваёю вадой. Рым яшчэ ў часы старажытных аквэдукаў гарантаваў кожнаму глыток добрай, горнай, смачнай вады. Ён і цяпер гарантуе чысьціню вады ў кране. Але я так і не пакаштаваў той вады. Досьвед вандроўніка не дазваляе пераступіць праз правіла: ня пі з лужыны, бо перакінесься ў казьляня. Ня пі! І хай сабе калюжына рымская, і аздабляў яе сам Джавані Бэрніні. Лепш зайсьці ў кавярню й замовіць халоднай кавы, пасядзець, паразважаць пра дзьверы...

У рымскіх кавярнях трапляюцца такія вузкія дзьверы, што прашчаміцца ў іх можна адно бокам, і толькі чалавеку няпоўнаму. Мне вельмі спадабаліся такія дзьверы. У Рай вядуць дзьверы вузкія. Павер, можа яшчэ вузейшыя, чым у згаданых кавярнях. Зусім не такія ў Ватыкане. Раскоша Ватыкану неацэнная.

Ёсьць жарт... На пытаньне: чаго ня ведае Бог? Адказваеш: ня ведае, колькі грошай у Ватыкану. І маеш рацыю. Бо, калі ходзіш па Ватыкане, ня тое, што грошы, чалавечае жыцьцё каштуе няшмат. Сьвятло, веліч, вечнасьць... Пра іх думаеш, яны хвалююць. А грошы? Добра, каб была дробязь ахвяраваць на рэстаўрацыю, ня больш. Але дробязь мусіш аддаць, бо Ватыкан і ўвесь Рым патрабуюць вечнай рэпарацыі.

Ходзіш па Рыме, блукаеш, бадзяесься й такое наплывае адчуваньне, што зараз возьмеш і правалісься ў антычныя катакомбы. Абрынесься, паб'есься й ня



вылезеш ніколі. І тады варта зайсьці ў касьцёл. У Рыме столькі вялікіх касьцёлаў, што можна бясконца гуляць у інтэр'ерах. Разглядаць алтары, сьценапіс, скульптуры... Маліцца, спавядацца, каяцца, калі заўгодна. У касьцёлах людзей мала, рухаюцца павольна, гавораць усе шэптам. Нават, калі ксёндз чытае Біблію, атрымліваецца ціха. Касьцёлы ратуюць. І ня толькі ў Рыме. У Празе, у Барсэлёне, у Вільні... А ў Менску чамусьці не. Затое ў нашай сталіцы гадзіньнікі паказваюць больш-менш дакладны час.

У невялікім гарадку Гаеце, што стаіць на ўзьбярэжжы паміж Рымам і Нэапалем, я заўважыў татальную няспраўнасьць гадзіньнікаў. У адным не стае стрэлкі, у другім — лічбаў, а ёсьць і такія, што на адзін бок цыфэрбляту паказваюць адзін час, а на іншы — другі. А сонечныя гадзіньнікі ўсе як адзін пакрыўленыя, іржавыя й нежывыя. Асабліва дзівіць: ні на адным цыфэрбляце ты не пабачыш дакладнага часу. Амаль такую ж карціну я назіраў і ў Рыме. Італія чамусьці ня любіць гадзіньнікаў. Напэўна, за гадзінамі на вуліцах сочаць адно прастытуткі.

Каго-каго, а прастытутак у Рыме шмат. Розныя, на ўсе густы: маладзенькія, старыя, трансвэстытныя, сьціплыя, нахабныя... Але асабіста мяне зьдзівіла толькі адна. Я ішоў начной вуліцаю. Бачу, на скрыжаваньні стаіць хлопец і глядзіць на мяне квадратнымі вачыма. Непрыемна, скажу табе шчыра. Чужы, як ні павярні, горад. Ноч. А на цябе глядзяць так, нібыта носіш на галаве рогі. Не зварочваю. Раўняюся зь ім і чую жаночы голас. Азіраюся й бачу... За рогам дому, на ходніку, сядзіць на кукішках і спраўляе патрэбы маладая прастытутка. Верне, ліе й размаўляе па сотавым тэлефоне. Спыняцца ня стаў. Якая мне да іх справа. Але ж зьдзівілі прастытутка з сутэнёрам.

Прастытуткі ў Рыме вельмі ваяўнічыя. На тое ёсьць прычына. Па-лацінску й італьянску публічны дом называюць "люпанар" ад лацінскага слова lupus — воўк, а прастытутак завуць ваўчыцамі. Менавіта прастытутка выкарміла братоў Ромула й Рэма, якія заснавалі вечны горад. Але такая брудная, калі зірнуць з боку публічнай маралі, міталягема не магла ляжаць у фундамэнце імпэрскай ідэалёгіі. Рымляне скарылі ўвесь тагачасны сьвет, а іх сталіцу заснавалі паўвыблядкі. Ідэолягі ператварылі прастытутку ў сапраўдную ваўчыцу. Але сучасныя рымлянкі лёгкіх паводзінаў небеспадстаўна лічаць сябе наступніцамі легендарнай ваўчыцы. У Рыме адчуваецца татальная археалягізацыя мысьленьня.

Каб стаць сапраўдным археолягам, трэба нарадзіцца ў Рыме. Відавочна. Ну, а калі ты не нарадзіўся ў сонечным горадзе, а жаданьне быць археолягам неадольнае, трэба ехаць у Рым і там жыць і капаць. Менавіта каля руінаў Капітолію я падумаў: археалёгія — гэта таксама культывацыя зямлі. Наагул культаў і культывацыяў існуе безьліч. Італьянцы культывуюць яшчэ й дупы сваіх абраньніц.



Італьянцы любяць трымаць жанчын на руках. Заводзяць у мора, бяруць на рукі, трымаюць і цалуюць. Зразумела, у вадзе вялікія дупы італьянак лёгкія й прыгожыя. Насамрэч, дупы ў іх неверагодна вялікія адносна ўсяго астатняга. Яшчэ Карэл Чапэк параўноўваў рымскіх жанчын з дарычнымі калёнамі. Пагадзіцца зь ім цяжка. Бо дзе ты бачыў калёну на тонкіх ножках. Хіба што ў чапэкаўскія часы большасьць італьянак насіла доўгія спадніцы. Але ў век тэлевізіі старачэскае параўнаньне кульгае на абедзьве нагі. Гэтымі нагамі запоўненая ледзь ня ўся тэлевізійная рэкляма. На ўсіх каналах прапаноўваюцца рамяні з маторамі, каб з дапамогаю вібрацыі зганяць тлушч з таўсьценных сьцёгнаў і клубоў. Яшчэ рэклямуюць чарадзейныя кроплі для пахуданьня, масьці й цэляфанавыя нагавіцы. Але ад ўсіх намаганьняў вынік амаль нулявы. Толькі мора ратуе дупы італьянак. Дарэчы, ёсьць мужчыны, якія бачаць у жанчыне перш-наперш дупу, такім у Італіі — Рай. Але я ня з тых, хто аддае перавагу менавіта гэтай частцы жаночай сутнасьці. Але гэта мітусьня.



Праз мітусьню сёньняшняга дня, праз раскошу баракальнага й рэнэсанснага каталіцызму ў Рыме выразна праступаюць рысы велічнага паганства старажытнай імпэрыі. Паганства — аснова, на якой вытканыя ўзоры хрысьціянства. Таго самага, на якім трымаецца юдахрысьціянская цывілізацыя Эўропы. І не крывіся ад патэтыкі, я й сам усё цудоўна разумею. Агульныя словы, абстрактныя велічыні... А пабачыш паліцыянтавага сабаку ў аэрапорце, і патас зьнікне.

У аэрапорце паліцыянт водзіць сабаку — вялікага рудога аўчара. Той прынюхваецца, азіраецца, шукае наркотыкі. Відавочна, сабака хоча знайсьці наркотык. А я думаю, што яго паводзяць-паводзяць па залях чаканьня, а потым завядуць у клетку й дадуць, гады рымскія, наркотык. А як інакш ён будзе шукаць сярод аэрапортнага тлуму ў вечным Рыме свой імгненны кайф?

Рым, жнівень 1999 году

лісты ў рэдакцыю

Адаму Глёбусу

Паважаны спадар!

Прачытаў Вашага «Пачварніка». Спадабалася. Разоў дзесяць перачытаў «Графітыста» — ізноў лёгка чытаецца, зразумела... але. Вось аб гэтым «але» я хачу з Вамі і пагаманіць.

Хто я? Я ня крытык, не літаратуразнавец, я карыстальнік, спажывец, чытач, які ў маленстве любіў чытаць. Кніжкі навучылі мяне думаць, стварылі сьветапогляд рамантычны, добразычлівы...

«Графітыст» — гэта не аповед, гэта казка... Вы толькі дакрануліся да тэмы і зрабілі скок у бок. Дзякаваць Богу, што хоць герой апавяданьня перамог, адкусіўшы лейтэнанту чэлес, і самае галоўнае, уцёк, што ўжо зусім фантастычна.

Вы карыстаецеся мовай ляканічнай, выразнай, вы ўжо валодаеце прафэсіяй. Вы — прафэсіянал. І вельмі шкада, што карыстаецеся сваім талентам ня вельмі як.

Сёньня беларускаму грамадзтву і беларускай літаратуры патрэбны свой Чэхаў, свой Купрын, свой Лёндан — той, хто піша шмат.

Трэба, каб напісалі, напрыклад, пра самага героя нашага часу — «баязьлівага чалавека». Мы чытаем у прэсе, што амонавец, якога цішком запыталі, ці атрымаў ён задавальненьне ад біцьця людзей у «бітве на Першамайскай», сказаў «не» і апусьціў вочы. «Я — з вамі» — шапнуў іншы міліцыянт на той жа бітве. Напісалі б пра тых, што ў душы — з намі, а на справе — зь імі.

Вось тэма дык тэма. Бацькі здраджваюць сваім дзецям. Заплюшчваюць вочы на відавочныя рэчы, не змагаюцца за будучыню сваіх дзяцей. У той час як прафэсійныя службы ФСБ рыхтуюць новы расейскі парадак. У гэты ж час нават адукаваныя людзі дазваляюць сябе замбаваць і толькі лыпаюць вачыма, уторкнуўшыся ў тэлескрынку.

Паважаны Адаме!

А калі б, напрыклад, лейтэнант у «Графітысьце» ня соваў чэлеса куды ня трэба, а проста адпрацаваў прафэсійны ўдар на мастаку, склаў пратакол і засадзіў чалавека на год у турму?

А каб потым праз 15 гадоў дачка ўжо маёра Алеся Марчука выйшла замуж за сына Казіміра Малюкевіча — на ўсю Эўропу вядомага мастака, які стала жыве ў Вільні? А каб апісаць адчуваньні былога лейтэнанта, а цяпер маёра Алеся Марчука, некалі жвавага, задзірыстага, што страціў на Каўказе нагу, калекі, жонка якога нядаўна памерла ад раку? Вось ён сівы, змучаны чалавек на вясельлі сустракае свайго Свата...

Адзін змоўчаў, другі пачырваней, пабялеў, пасівеў... Вось тэма: «За ўсё ў жыцьці трэба плаціць. І прыходзіць час зьбіраць камяні».

Паважаны Адаме!

Чакаю ад Вас значных, цудоўных аповедаў.

Кастусь Травень



Новы нумар часопіса ARCHE прысьвечаны «Паталёгіям грамадзтва», сапраўдным і фальшывым. Вы знойдзеце ў ім сэкс, нецэнзуршчыну, шызафрэнію, інтэлектуальныя махлярствы, усенароднага фашыста, трансгрэсіўную літаратуру, наркотыкі, хуліганствы. У продажы ў кнігарнях, у распаўсюднікаў і ў «Белсаюздруку» з 10 сьнежня.

У Інтэрнэце — ужо цяпер:
http://arche.home.by

З наступнага году ARCHE будзе выходзіць штодвамесяцы. Тэмы першых нумароў наступнага году: «Панславізм: думка і злачынствы», «Яўрэі, габрэі, жыды. Беларуска-жыдоўскі дыялёг», «Гомасэксуалізм, прадстаўлены для гетэрасэксуалаў».

ARCHE

першы беларускі часопіс XXI стагодзьдзя.

САБАЧЫЯ ГІСТОРЫІ

Віктар ШНІП

У аднаго сабакі забалелі пярэднія зубы. І пайшоў сабака да доктара. А доктар агледзеў сабаку, выклікаў Граждана і выпісаў загад: «На працягу тыдня разабрацца і дакласьці!»

Адзін сабака вярнуўся з Афрыкі. Чорны, як абізяна. Прыйшоў да сваіх дзьвярэй. А на дзьвярах — партрэт Граждана.

Адзін сабака прыйшоў да Віктара Шніпа і кажа: «Не пішы ты болей вершаў!» А Шніп і спалохаўся: «Чаму?» «А таму што ўжо Граждан будзе пісаць!»

Адзін сабака любіў сала. Пакладзе яго на стол, сядзе перад ім і любуецца. Даведаўся пра такую любоў Граждан. Прыйшоў да сабакі і заявіў: «Аддай мне сала!» А сабака ў адказ: «Прыходзь празь месяц».

Адзін сабака валодаў ангельскай мовай. А Граждан карыстаўся слоўнікам і харчаваўся ў Макдональдзе.

Адзін сабака быў вельмі маленькі, і яго ўсе крыўдзілі. Убачыў гэта Граждан і сказаў: «Я цябе абараню...» — і пасадзіў сабаку ў Бастылію.

Адзін сабака любіў паесьці. Залезе да каго-небудзь у агарод, нагрызецца буракоў, а тады ляжыць у баразьне і памірае. Заўважыў гэта Граждан і аж затрымцеў: «А можна я вам верш прысьвячу?»

Аднаму сабаку прыслалі ліст з Кітая. Стаў сабака чытаць уголас. Пачуў гэта Граждан і скінуўся з балькону.

Адзін сабака быў адзін. Доўга. І Граждан ня ведаў пра гэта.

Адзін сабака забыўся, чаго ён пайшоў у бюро даведак. Сустрэў Граждана і сказаў: «Мяне завуць Тузік». ■



Наша Ніва 90 гадоў таму

Навіны з Горадні

26 лістапада 1909 году

З восені ў нас перуном прыбіла дзяўчыну; яе пахавалі. Уначы стораж на магілках пачуў енк адтуль, дзе была сьвежая магіла. Але махнуў рукой і пайшоў спаць. Назаўтра паліцыя адкапала дамавіну і паказалася, што дзеўчына была ў летаргічным сьне. (Не памёрла, а толька заснула). Ачнуўшыся, задушылася; валасы мела парваныя і твар пашарпаны.

Цяпер у нас набіраюць навабранцоў. Ня дай Бог што робіцца: прайсьці ня можна — хоць сядзі дома і не вытыкай носу.

Аляксюк

прыватныя абвесткі

Сардэчна віншуем

Норбэрта Рандава

з 70-годзьдзем!

ГАЗЭТА ПРЫМАЕ ТАКСАМА АБВЕСТКІ БОЛЬШЫМ ШРЫФТАМ ЗА НЕВЯЛІКУЮ ПЛАТУ

- *да 20 словаў – 50 000 руб.,*
- *звыш 20 словаў – 70 000 руб.;*
- *па-мастацку аформленая аб'ява – 20 000 руб. за 1 кв. см;*
- *па-мастацку аформленая аб'ява памерам больш за 24 кв. см з улікам кошту арыгінал-макету – ад 40 000 руб. за 1 кв. см.*

За аб'яву пра сямейныя падзеі – зьніжка.

Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пералічыць грошы праз пошту пераводам на наступны разьліковы рахунак: *Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», р/р 3012213050010 Ленінскае аддз. «Белбізнэсбанку» г.Менску, код 763.*

На зваротным баку блянка паштовага пераводу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна і чытальна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і АБАВЯЗКОВА ДАДАЕЦЦА СКАЗ: «ЗА РЭКЛЯМНЫЯ ПАСЛУГІ».

Рэдакцыя

ЖЫВІ ДЛЯ СЯБЕ — ЗМАГАЙСЯ ДЛЯ БЕЛАРУСІ!

Беларускі Нацыянальны Кангрэс

Падрыхтаваны да друку «ТУРЭМНЫ ДЗЁНЬНІК» С.Адамовіча

Шукаем фундатараў.

Зьвяртацца:

Рэдакцыя «НН» альбо: 220013, Менск, вул. Сурганава, 45/3. Адамовіч С.

Малады Фронт запрашае аматараў беларускай музыкі («NRM», «Нейродюбель», «Палац», «Крыві», «Новае Неба» і інш.) на свае паседжаньні шточацьвер а 19-й гадзіне — Менск, Варвашэні 8. Т.: (017) 284-50-12. Тэлефануйце, прыходзьце. Пішыце

Радзіма ў небясьпецы! Ратуй яе — ідзі ў «Белы Легіён». Пэйджэр 278-11-01, аб. 4979

«Голас Краю» — газэта новага пакаленьня беларускіх нацыяналістаў. Бог, Беларусь, Воля — нашыя нязьменныя арыенціры. Зь імі пераможам!

Набуду драйвэр(ы) загрузкі беларускага шрыфту ў матрычны прынтэр «Star». Мікалай, Горадня, 230005, а/с 101

Ад Вас 50 тысячаў — і Вы атрымаеце першую ў Беларусі **футбольную газэту «OFFSIDE»** на тарашкевіцы. 222120, Барысаў, а/с 541, (01777) 978-63

Куплю 3-ці том Поўнага збору твораў Янкі Купалы (у 9-ці тамах), кнігу В.Быкава **«Сьцяна»**. 247940, Гомельская вобл., Петрыкаў, Талстога 22, т.: (02350)-512-66

Аматары беларускай музыкі ў Берасьці! Каму патрэбныя касэты і CD — зьвяртайцеся! Сяржук. Т.: 24-54-56

Пазнаёмлюся з хлопцам 23-30 гадоў бяз д/з, найперш — добрым сябрам. Вольга 24/152/40. Захапленьні: прырода, жывёлы, вандраваньні. Пажадана фота (вярну). Дзяржынск, вул.Фурманава, 9-20, т.: 6-53-75

Прадаю шкло ад сэкцыі «Vilnius» — 10 шт. (43х52 см), пісьмовы стол, тэлевізар «Гарызонт»-261 — ужываныя, нядорага. Т.: 265-75-73 (пасьля 17-й)

Прадаю «Біблію» (т.1-3) Ф.Скарыны за 10 млн. руб. і «Лексычны атлас беларускіх народных гаворак» (т.1-2). Т.: 227-72-26 (21.00—24.00). Віктар

Хлопец (24), в/а, філёляг, шукае працу. Т.: 265-75-73 (пасьля 18). Эдвард

Сяргею Паўлоўскаму! Пасьля Вашых артыкулаў, дзе пішаце пра БНФ, адразу прыгадваю азаронкаўскую кінастужку. Зычу пасьпяховага выхаду з «ружовага туману». Чытач

На гістарычным шляху беларусаў да свабоды выключнае месца займае дзейнасьць і творчасьць Кастуся Каліноўскага. Данясем яго праўду да шырокіх мас народу. Навукова-асьветнае таварыства імя К.Каліноўскага. 224020, Берасьце-20, а/с 19

Набуду кнігу Масьляніцынай «Млын на сямі колах». Т.: 237-93-74. Галіна

Віншую Тарлецкага з выхадам чарговага нумару ягонага гей-часопіса. Казімір С.

Віншую геяў з адкрыцьцём гей-клюбу. Зоська Доўгая

Мілага, цудоўнага, шчырага, узьнёслага, таленавітага **Аляксея Фралова** сардэчна віншуем з 25-м Днём яго народзінаў!

Аляксей Фралова віншуем з Днём нараджэньня! Прамяні твайго шчырага сэрца адагрэюць Беларусь, як грэюць усіх вакол цябе!

Пасьведчаньне (згубленае) інваліда 2-й групы сэрыі 08 № 0042961 на імя Хазяніна К.М. лічыць несапраўдным

Хлопцы й дзеўкі, сьвядомыя сябе беларусы й беларускі. Адгукніцеся сапраўднаму БЕЛАРУСУ — Раману. 223710, Салігорск, Багамолава 24-209

Аленка Сярэдзіч!!! Шчыра віншую Цябе з Днём народзінаў. Заставайся такой, як зараз. Пятровіч

Шукаем кантактаў з прыхільнікамі паганскае рэлігіі. 220082, Менск, а/с 188

Спадарства! Віншую з угодкамі Слуцкага збройнага чыну! Жыве Беларусь! Жыве вечна! Алесь Загорскі

Элітарная беларуская паганская й эзатэрычная цяжкая музыка. А/с 342. Менск, 220050. Дашлем сьпіс наяўнае прадукцыі

Панове! Растлумачце хто адрозьненьні між менскімі ліцьвінамі й гомельскімі. А/с 121, Менск, 220086

Хлопец (30), в/а, сымпатычны, гей, Стралец, з гумарам, чакае ліста ад Вас. Вы — ад 30 да 50, з в/а. Знаходжуся ў М.П.В. Падрабязнасьці пры перапісцы. Мэта — стварэньне гей-саюзу. 222125, Менская вобл., Барысаўскі р-н, Навасады, п/с 15/14/32

Шукаю шэранькае кацянятка, 1-2 месяцы, хлопчык. Званіць пасьля 19.00 ці зранку. Т.: 256-21-67. Спытаць Ганну

Андрэя Мельнікава віншуе з тым, што ён ёсьць жывым, здаровым і аптымістычным — яго хросны

Андрэй Мельнікаў, з Днём народзінаў! Няхай у цябе ўсё ладзіцца. Любім, чакаем. Сябры «Малога Палесься»хх

Вельмі цікаўлюся, як усьведамляюць людзі паняцьце «нац. дэмакратыя». Допісы, калі ласка, дасылайце на адрас: 224002, Берасьце, Жукава 7-43

Анёлачак мой Зямны, чым аддзячу за шчасьце, якое ты мне падаравала? Сьветлы сусьвет Мой...

Шаноўнае прывітаньне Зьмітру Гурневічу ад Алісы зь Менску!

Фэн-клюб гурта «Камэлот» прымае заяўкі на атрыманьне другога альбому. Ад Вас — капэрта са зв/а. 220117, Бялецкага 32-82, т. 274-58-08

Склікаем сяброў! Маладыя беларусы-нацыяналісты, пішыце! Хлопцы зь Віцебску: Віцебск, вул. Лакаматыўная 7-2-6, 210001, т.: 37-02-61

Падзеі 17 кастрычніка — як гэта было, інтэрвію чалавека, які скочыў у Сьвіслач, уцякаючы ад амону. Новыя назовы станцыяў мэтро і шмат што іншае чытайце ў газэце «Радавая Беларусь» за 24 лістапада. Ад Вас — капэрта з маркаю й купон б/а + 25.000. Адрас: а/с 169, 220030, Менск

Радуйцеся, мае даражэнькія лялечкі, я хутка іду пад вянец! Буба, патэлефануй! Lady S.

ТБМ імя Скарыны стварыў ініцыятыўную групу па ўзнаўленьні дзейнасьці **Бацькоўскага камітэту Менску.** Мэтай камітэту зьяўляецца абарона канстытуцыйных правоў грамадзян Беларусі на атрыманьне адукацыі і дашкольнага выхавання па-беларуску. Бацькоў і ўсіх зацікаўленых просім зьвяртацца ў сядзібу ТБМ: 220005, Менск, Румянцава 13, т. 284-85-11, E-mail: tbm@tbm.lingvo.minsk.by

Відэа «Звычайны прэзыдэнт/Менская вясна-96». Станкевічу Алегу, 220107, а/с 150

Відэа па-беларуску! «Пяты элемэнт», «Вольныя танцы» — у продажу. «Адважнае сэрца» — па падпісцы. Т.: 284-85-11, 240-78-01

Ваш рэклямны ролік пабачаць ня менш за тысячу беларусаў, калі Вы разьмесьціце яго ў відэазапісе перад фільмам «Адважнае сэрца». 220107, а/с 150. Т.: (017) 213-43-52, 240-78-01

Маленькія пудзеляняты ад мамы — прызёра Беларускай лігі сэксуальных меншасьцяў. Аддамо ў пяшчотныя рукі. Т.: 213-26-93, 221-92-05

Шырокі выбар запісаў беларускай музыкі (рок, поп, джаз, бардаўская, гітарная і клясычная). 220085, Менск, а/с 5. Т.: 249-08-88, Віталь

Пачалі працу **выставы беларускіх касэтаў:** Маладэчна — у офісе ТБМ — Хмяльніцкага, 10 (інтэрнат Палітэхнікуму), цаверх 3. Прыходзьце штосераду і чацьвер з 17 да 19; Гародня — К.Маркса, 11, панядзелак і серада; Менск — Варвашэні, 8, чацьвер з 19

Беларуская музыка ў Internet: БМАgroup: http://fly.to/bmagroup; «ULIS»: http://fly.to/ulis; «KRIWI»: http://fly.to/kriwi; «Narodny Albom»: http://fly.to/nalbom

паштовая скрынка

Міхасю С. зь Менску. *Няма сэнсу дыскутаваць далей — і Вам, і нам, і ўсім усё ясна. Ці гэта Вы надрукаваліся ў газэце «Лімонцы»?*

Сяргею Г. зь Берасьця. *Не дапоўнім, бо гэта рымэйк беларускіх савецкіх арыгіналаў.*

Ангеліне М. зь Менску, **Л.Б. і Я.К.** з Воршы. *«НН» застаецца перакананаю ў патрэбнасьці новага курсу БНФ.*

Віталю С. зь Менску. *Ня дужа даўно тэлефанавалі яму ў Варшаву, прасілі, дык адказаў: «Няма калі».*

Сяргею Б. з Гомеля. *Пра Скарыну й сэкс у Вас выйшла нешта няяснае.*

Хведару К. з Маладэчна. *Шкада, што газэта да Вас даходзіць толькі ў пятніцу. Мо маладэчанскі шапік ТБМ мог бы колькі трэба асобнікаў у нас забіраць у панядзелак, а Вы б там куплялі?*

У жыцьці герояў Вашых эцюдаў не адбываецца нічога вартага ўвагі пісьменьніка, а самі яны не ажываюць са старонак, і мы іх не пазнаем.

Сяргею П. зь Берасьця. *«Грамадзкая фрустрацыя праз палітычны нарцысізм»: quod licet B. non licet P. Моментамі заскладана як для газэты. Моментамі надмерна прыгожа й пакручаста — што выклікае недавер. Агульная цьмянасьць і манія заразумелых словаў і зваротаў. Цяжка ў маладым веку пісаць у неакрэсьленым жанры. Цьвёрда вызначаны капыл, напрыклад, кніжнай рэцэнзіі, фэльетону ці міжнароднага камэнтара дысцыплінаваў бы. Але вельмі просім не пакідаць пісаць.*

Кастусю Б. з Мар'інай Горкі. *Чытайце тых пісьменьнікаў, якія згадваліся ў «НН» ад '91-га да '99-га.*

Сержуку Н. *Вельмі добра Вы пішаце пра «неасэнсаванае чаканьне моманту, калі можна будзе выкарыстаць свой патэнцыял». Толькі ж можна і не дачакацца. І яшчэ кажуць, што два самыя брыдкія заняткі — чакаць і даганяць... Часам здаецца, што Лукашэнка ў такіх развагах ні пры чым, або што ён — толькі «адмазка», якой людзі апраўдваюць сваё баімства жыць.*

БЕЛТУР тэл. (017) 216-99-90, 216-99-68, 216-95-31. вул. Альшэўскага 24, п.408

БЕЛАРУСЬ
д/а «Нарач», т/г «Нарач», п. «Спутнік», п. «Журавушка»;
Дом творчасьці пісьменьнікаў *«Іслач» (Ракаў);*
Браслаўскія вазёры: *б/а Слабодка (катэджы), б/а «Дрывяты» (эўракорпус)*

ЛІТВА, ЛАТВІЯ, ЭСТОНІЯ
Візавая падтрымка

ДА ЦЁПЛАГА МОРА!
Кіпр, Эгіпэт, ААЭ, Тайлянд, Туніс, Гішпанія

ЗША
Адпачынак у Маямі

ПАРЫЖ, ЛЁНДАН
(авія, Менск)

ліц. № 561/3 ад 9.9.1998 г. да 9.9.2000 г. МСТ РБ

НАША НІВА КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220050, Менск, а/с 537

Тэкст _____

_____

Імя і прозьвішча _____

Адрас, тэлефон _____

«Наша Ніва» незалежная газэта, заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991. Галоўны рэдактар Сяргей Дубавец. Рэдактар выпуску Андрэй Дынько. Мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі. Адказны сакратар Аляксандра Макавік. Дызайн-макет Лявон Раманчык. Набор Насты Дзядзенкі. Выдавец: рэдакцыя газэты «Наша Ніва». Заснавальнік Павал Жук. Адрас для допісаў: 220050, Менск, а/с 537.
Tel/fax: (017) 227-78-92. E-mail: niva@user.unibel.by Http://members.xoom.com/Nasa_Niva.

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. Наклад 3069. 6 палос фарматам А2. Нумар падпісаны ў друк 17:30, 28.11.1999. Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 6115. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны.
Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам па друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г.Менск, пр.газэты «Известия», д. 8, кв. 173.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12